С. ПАЎЛОВІЧ.

Пішы самадзейна.

Разьвіцьцё навыку самастойнага пісьма.

Пасобнік для беларускае школы і самавукаў.

Ч. I.

Першы год навучаньня (пасьля азбукі).

ВІЛЬНЯ, 1929 г.

Беларуская Друкарня Ім. Фр. Скарыны, Вільня, Людвісарская 1.

Тым настаўнікам, якія карыстаюцца гэтым пасобнікам, рэкамэндуем азнаёміцца з выдадзенаю асобна брашураю „Мэтадычныя ўваці“ да пасобніка «Пішы самадзейна» таю-ж аўтара.

Прафэсару М. Массоніўсу ў знак глыбокае пашаны — аўтар.

4/VII. 1929.

С. ПАЎЛОВІЧ.

Пішы самадзейна.

Разьвіцьцё навыку самастойнага пісьма.

Пасобнік для беларускае школы і самавукаў.

З лічнымі малюнкамі мастака М. Васілеўскага.

Ч. I.

Першы год навучаньня (пасьля азбукі).

Выданьне аўтара.

ВІЛЬНЯ, 1929 г.

Беларуская Друкарня Ім. Фр. Скарыны, Вільня, Людвісарская 1.

Правілы для вучняў.

1 Ужывай толькі родную мову, родныя беларускія словы.

2. Пішы заўсёды *самастойна*, бяз чужой дапамогі і радаў. Лепей мала напісаць, мо' нават зусім нічога не напісаць, чым выкарыстаць чужую працу, або сьпісаць ці падглядзець у суседа.

3. *Наперад уважліва абдумай,* што напішаш і скажы сабе некалькі разоў голасна, як будзеш пісаць, а потым ужо пішы.

4. Калі ня ведаеш, як напісаць, *запытайся вучыцеля* ці каго іншага, хто можа памагчы.

5. *Кожнае практыкаваньне,* раней ці пазьней, а павінна быць *абавязкава зроблена,* і зроблена з разуменьнем, старанна, дакладна.

6. Ніколі *ня пішы абы як.* Заўсёды глядзі ўзор у кнізе, каб напісаць правільна, добра, без цамылак.

7. Калі-б зрабіў якую памылку і табе яе паправілі, напішы некалькі разоў папраўленае слова ці практыкаваньне.

8. Калі пішаш, сядзі проста і ня горбіся; правільна трымай сшыток і асадку, як паказваў вучыцель.

9. Сядзі заўсёды так, каб сьвятло падала на сшыток з левага боку.

10. Пільнуй, каб сшыток заўсёды быў чыстым.

11. Адлегласьць паміж дзьвёма лінейкамі ў сшытку павінна быць 5 мілімэтраў, у аддзеле III — 4 мілімэтры.

12. Старайся пісаць заўсёды чарнілам.

13. У канцы кніжкі ёсьць слоўнік труднейшых слоў, якія патрэбны будуць таму, хто піша. Калі ты няпэўны, як пісаць якое слова, паглядзі ў слоўнік.

Практыкаваньне 1.



1. Каго вы бачыце на малюнку? Адкажэце, хто што робіць.

2. Напішэце, хто тут намалёваны.

Маці. Бацька.
Брат. Сястра.
Дзед. Унук.

3. Хто ёсьць у вашай сям'і? Назаві ўсіх па іменьні.

Практыкаваньне 2.

1. Што бачыце на малюнку? Што робяць дзеці? Хто іхнія таварышы?

Хлапчукі. Дзяўчаткі. Хата. Галубы. Кот. Сабака. Плот.

2. Прыдумайце імя для кожнага хлапца і дзяўчынкі.

Практыкаваньне 3.

1. Каго і што бачыце на малюнку.

Вуліца. Селянін.
Хаты. Воз. Сена.
Калодзеж.

2. Напішэце, як называецца ваша вёска.

Практыкаваньне 4.

1. Што вы бачыце на малюнку? Якая гэта школа? Што робіць вучыцель? Што робяць кожны вучань і вучаніца?

2. Напішэце, хто і што намалёвана тут.

Школа. Вучыцель. Вучні. Сад. Гарод

3. Напішэце, як называецца ваша школа.

Практыкаваньне 5.

1. Паглядзеце на малюнкі і напішэце, хто што робіць



Прыклад. Касец косіць.

2. *Напішэце адказы на пытаньні.*

Хто сее? Хто малоціць? Хто меле збожжа? Хто бараніуе? Хто лётае? Хто плавае? Хто вучыць? Хто вучыцца?

Прыклад. Гаспадар сее.

3. ЗАГАДКА (напішэце разгадку). Маленькі—крывенькі, усё поле абегаў.

4. Намалюйце касу, серп і верацяно.

Практыкаваньне 6.

1. Напішэце, хто што робіць.



Прыклад. Жанчына дoіць карову.

2. Напішэце, якія іменьні даюць на вёсцы каровам.

3. *Напісаць, хто што робіць.* Вучыцель вучыць. Купец гандлюе. Кравец... Жняя... Сявец... Маляр... Лекар... Пісар...

4. Намалюй грыбы ў лесе. Намалюй сякеру.

Практыкаваньне 7.

1. Напішэце, якая ёсьць у нас хатняя жывёла.





2. Напішэце, што дае гаспадару авечка? карова? сьвіньня?

Прыклад. Авечка дае воўну.

Практыкаваньне 8.

. Паглядзеце на малюнкі і напішэце, хто што робіць.

2. Па дадзенаму ўзору напісаць, хто што робіць.

Пісьменьнік піша. Друкар... Пільшчык...
Насільшчык... Муляр... Барабаншчык...
Палясоўшчык... Шкляр...

Практыкаваньне 9.

1. Напішэце, што бачыце на малюнку.
2. *Напішэце адказы на пытаньні.* Хто заяц? Хто зязюлька? Дзе ластаўка вье сваё гняздо? Дзе жыве заяц?

Прыклад. *Зязюлька-птушка.*

3. ПРЫКАЗКА. Жораў з цяплом, ластаўка з летам.

Практыкаваньне 10.

1. Напішэце, якія зьвяры тут намалёваны.

2. *Напішэце адказы на пытаньні.* Які ў ліса хвост? Чым жывіцца ліс? Хто з зьвяроў ласы на курэй?





Прыклад. Хвост у ліса пушысты.

3. ПРЫКАЗКА. Ваўка да лесу цягне. — Унадзіўся воўк у авечкі.

Практыкаваньне 11.

1. Нашыя хатнія птушкі.



Качка...

2. Нашыя дзікія птушкі.

Зязюлька. Верабей.

Жайранак. Чыж. Гусел.

Напішэце, якіх яшчэ ведаеце дзікіх птушак.

Практыкаваньне 12.

1. Што бачыце на гэтым малюнку? Што відаць на дарозе? Хто купаецца?

2. Ці ёсьць у вашай вёсцы рэчка? Як завецца?

3. Напішэце, якія дзеравы растуць у нашых лясох,

Прыклад. Асіна...

4. Напішэце, якія дзеравы і хмызьнякі растуць каля вашае хаты.

Прыклад.

Сьліва... Язьмен....

5. Намалюйце дзеравы.

6. ЗАГАДКА. Стаіць гай, пад гаем мігай, пад мігаем сапай, пад сапаем хапай.

Практыкаваньне 13.

1. Напішэце, якія гэта птушкі.

2. Напішэце, якія птушкі застаюцца ў нас на зіму.
3. Якія птушкі адлятаюць у вырай?
4. Намалюй якую-колечы птушку і падпішы яе назоў.
5. ПРЫКАЗКА. Ня бачыць сава, якая сама.

Практыкаваньне 14.

Юстынка — памочніца маткі.

1. Напісаць, што робіць Юстынка.

2. *Жаночая праца.*

Напісаць адказы на пытаньні. Хто гадуе дзяцей? Хто варыць ежу? Хто шые? Хто пячэ хлеб? Хто поле лён?

Прыклад. *Матка гадуе дзяцей.*

ПРЫКАЗКА. У сваім краю, як у раю. — У каго ёсьць матка, у таго галоўка гладка.

Практыкаваньне 15.

1. Напішэце, якія гэта рыбы.







Шчупак–рыба. Карась.

2. Яшчэ якія ёсьць рыбы ў нашых рэках і вазёрах? Напішэце.

3. *Напішэце адказы на пытаньні.* Што гарыць? Што цячэ? Што замярзае? Што шуміць? Што пасьпявае? Што зелянее?

Прыклад. Агонь гарыць.

Практыкаваньне 16.



1. Падпішэце назоў.

2. *Напісаць адказы.* Чым бароніцца рак? Як паўзе заўсёды рак? Як ловяць ракоў? Дзе жыве жаба? Хто жывіцца жабамі на балоце?

3. Намалюй рыбу.

Практыкаваньне 17.



1. Напішэце, што бачыце на гэтым малюнку.

2. Як называюцца суседнія вёскі? мястэчка? горад? Напішэце.

3. ПРЫКАЗКА. Што край, то і звычай.



4. Нашы звычайныя казюлькі: чмель...

5. ЗАГАДКІ. Ляціць—вые, сядзіць—землю рые.—Чоран, ды ня воран, рагат, ды ня бык.

Практыкаваньне 18.





1. Напішэце, як называюцца гэтыя будынкі.

Што сяляне трымаюць у пуні? у сьвірану? Якая страха на пуні? Чыё гняздо на пуні? Яшчэ якія будынкі маюць вясковыя гаспадары?

2. Дапісаць сказы (на пытаньне: што робіць?). Бацька ў полі... Жанчына на гародзе... Дзяўчынка ў хаце... Купец у краме... Вучыцель у школе...

Прыклад. *Гаспадар у полі баранує.*

3. ЗАГАДКА. Аснова саснова — саламяны уток (дах).

Практыкаваньне 19.







1. Напішэце, як называюцца гэтыя прылады. Што робяць сахою? Што робяць бараною? Што робяць цэпам? Якія яшчэ ёсьць гаспадарскія прылады?

Барана-гаспадарская прылада.

3. ЗАГАДКА. Вышла пасьля зімы хлапцоў дваццаць пяць — сляды знаць. 4. Намалюй вілы (для сена) і цэп.

Практыкаваньне 20.

1. Напішэце, што намалёвана. З чаго робіцца палатно? Хто шые кашулю? Хто шые сярмягу? З чаго тчэцца сукно? Калі стрыгуць авечак?

2. Беларуская мужчынская вопратка.

Сярмяга...



Беларуская жаночая вопратка.

3. Рэчы, у якія прыбіраюцца дзяўчаты ў сьвята: *каралі...*

4. Наша гародніна: *морква.*

Практыкаваньне 21.



1. Напішы, што намалёвана. Хто шые боты? З чаго робяць боты? З чаго плятуць лапці?

Кот і мышка (гульня).

Дзеці стаяць у кругу. Алеся — мышка ўцякае, а Рыгорка — кот ловіць яе. Мышка ўцякае добра. Яе прапускаюць у круг і з кругу. Ката затрымліваюць, ня пушчаюць. Ажно расчырванеўся Рыгор, пакуль злавіў мышку — Алесю.



2. *Адкажэце на пытаньні.* Хто мышка? Хто кот? Каго прапускаюць у круг? Каго затрымліваюць? Ці злавіў кот мышку?

Напішэце, якія самыя любімыя вашыя гульні.

3. ПРЫКАЗКА. Падружыліся бот з лапцем.—Лепш свой лапаць, як чужы бот.

Практыкаваньне 22.

1. Сьпісаць дні тыдня і месяцы году.

Нядзеля. Панядзелак. Аўторак. Серада. Чацьвер. Пятніца. Субота.

Студзень. Люты. Сакавік. Красавік. Травень. Чэрвень. Ліпень. Жнівень. Верасень Кастрычнік. Лістапад. Снежань.

2. Хто што робіць?

Селянін гарэ.	Гаспадар малоціць.
. . . . . піша.	Маляр . . . . .
. . . . . будуе.	Музыка . . . . .
. . . . . бяжыць.	Доктар . . . . .

3. Дождж. Сьцюжа. Скрабецца і вішчыць на панадворку пад дзьвярыма хаты Лыска. Чаго хоча Лыска? Напішэце.

4. ПРЫКАЗКА. Пытае люты, ці добра ногі абуты.

Практыкаваньне 23.

Зброя, мэбля, пісьменныя прылады.











1. Напішы, якія намалёваны тут рэчы. Каму патрэбны гэбель? а сьвярдзёлак? З чаго зроблены ўслончык? Хто робіць хамуты? Што л'юць у чарнілку? Што вешаюць у шафе?

2. Напішэце, якую зброю накладаюць на каня.

3. Намалюй стол і ўслон, пілу і сякеру.

4. ЗАГАДКА. Маленькі сабачка скруціўшыся ляжыць: ня брэша, ня кусае, і ў хату ня пускае.

Практыкаваньне 24.

Алеся і Шарык.

Дала мама Алесі абаранак. Алеся вышла з абаранкам на панадворак. На панадворку быў Шарык. Стала Алеся есьці абаранак. Шарык толькі аблізваецца... Глядзеў, глязеў Шарык і рапгам хоп за абаранак! і пабег. Сьлёзкі паліліся з вачэй Алесі. З плачам кінулася Алеся да хаты. Мама дала ёй другі абаранак, але загадала есьці яго ў хаце.

1. *Напісаць адказы на пытаньні.* Што Алеся атрымала ад мамы? Куды Алеся вышла з абаранкам? Хто быў на панадворку? Што зрабіў Шарык? Што сталася з Алесяй? Да каго яна пабегла? Чым мама заспакоіла яе?

2. Напішэце, якія іменьні даюць на вёсцы сабакам.

3. Намаляваць кручаны абаранак.

Практыкаваньне 25.



1. *Уставіць прапушчаныя словы (на пытаньне: што робяць?)*

Дзеці... у школу. На полі... бульбу. Сяляне... сена. З кудзелі... ніткі. Вучні... песьні. З хлеву... гной.

У траўні... з зямлі трава. У лістападзе... лісьце з дзерава. У сьнежні... сьнегу. У красавіку... краскі.

2. ЗАГАДКІ. Чатыры хадасты, дваста бадасты, адзін хлабыстун.— Маленькае, кругленькае — за хвост не падняць.

Летам ёлка, а зімою цёлка.

3. ПРЫКАЗКА. Людзей слухай, а свой розум май.

Практыкаваньне 26.

Ежа, начыньне, гаспадарская прылада.













1. Напішэце, што тут намалёвана. Што мелюць у жорнах? Што прывязана на прасьніцы? З чаго зроблена вядро? а міска? У чым расчыняюць хлеб? З чаго пякуць хлеб?

Хаўрусам.

Угледзіла мурашка зерня на дарозе і хацела занесьці яго ў мурашнік. Але зерня было важкае, і адна мурашка ня мела сілы нават яго падняць. Што рабіць? Бяжыць мурашка дамоў і кліча на падмогу таварышоў. Разам узяліся ўсе за работу: удзьвёх ухапілі зерня за адзін канец, удзьвёх за другі, іншыя пасярэдзіне плячыма падпіралі. Так занясьлі яны зерня да мурашніку, усёй мурашкавай грамадзе на пажытак.

2. *Напішэце поўныя адказы на пытаньні.* Што знайшла мурашка? Якое было зерня на вазе? Ці адна мурашка магла занесьці яго ў мурашнік? Каго яна паклікала на падмогу?

Ці разам усе яны здолелі занесьці зерня? Каму зерня пашло на пажытак?

3. ЗАГАДКА. Мех на мяху і жаўнер на вярху.

Практыкаваньне 27.

1. З наступных слоў выбярыце і напішэце адно па адным усе словы, якія азначаюць ежу, начыньне, абутак і гаспадарскія прылады.

Талакно. Конаўка. Бочка. Сыр. Варыва. Калатоўка. Кісель. Талерка. Стаўбун. Тарка. Кубел. Булён. Валёнкі. Цэбэр. Аналонік.

2. Якія хатнія рэчы робяцца з дзерава?

Практыкаваньне 28.

1. *Дапісаць сказы на пытаньне: што робяць?*

Буслы на балоце... Вавёркі на дрэвах... Дактары ў бальніцы... Кавалі ў кузьні... Сьлесары ў майстроўні... Пчолы ў вульлі... Рабочыя на чыгунцы... Дзяўчаты на вячорках... Сяляне на сходзе... Бабы на рэчцы ..

2. Ежа беларускага селяніна: *бульба...*

3. Намалюй лыжку, нажа і відэльца.

4. ЗАГАДКА. Цераз мора катоў хвост.

Практыкаванне 29.

1. Напішэце, хто што робіць.

Прыклад. Гаспадар шмаруе кола.

Бясхвостая лісіца (байка).

Папалася лісіца ў пастку і, каб выратавацца і ўцячы, адарвала сабе хваста. Але без хваста была ёй вельмі сорамна сярод іншых лісіцаў з хвастамі. Дык стала лісіца намаўляць усіх хвастатых, каб паадгрызалі сабе хвасты.

— Хвост, кажа, і ня прыгожая, дый зусім-жа і не патрэбная рэч: толькі лішні цяжар за сабой цягаем.

А стары ліс на гэта і адказвае:

— Чаму-ж ты, кума, не казала гэтага, калі мела, як усе, хваста?

Куртатая ліса ня мела што адказаць, і пабегла ў лес.

2 *Адказаць на пытаньні.* Аб кім гаворыцца ў байцы? Хто папаўся ў пастку? Як выратавалася лісіца з пасткі? Ці была гэта ёй прыемна? Да чаго яна пачала намаўляць хвастатых лісіцаў? Ці паслухалі яе лісіцы? Што тады зрабіла ліса?

Практыкаваньне 30.



1. Напішэце, якія намалёваны тут рэчы.







2. А што тут намалёвана? Напішэце.

3. Напішэце, якое збожжа звычайна сеецца нашымі гаспадарамі.

4. ЗАГАДКА. Адным паясом тысяча падпяразана.

Грэчка...

Практыкаваньне 31.

1. Напішэце, якія намалёваны тут рэчы і істоты.

2. А што тут намалёвана? Напішэце.

3. Якія краскі растуць у нас каля хаташ і ў полі?

Званкі...

4. Намалюй два вакна.

Практыкаваньне 32

1. *Зьмяніць сказы з адзіночнага ліку ў множны.*

У гаспадара быў конь. — *У гаспадара былі коні.*

Па двару хадзіла сьвіньня. — *Па двару хадзілі сьвіньні.*

Вясёла пяяла птушка. — *Вясёла пяял... птушк...*

Плакала малое дзіця. — *Плакал... мал... дзець...*

Хлопец нёс мяшок. — *Хлап... нясьлі .....*

На плоце сядзеў верабей. — *На плоце .....*

2. *Напісаць адказы на пытаньні.*

Што ідзе? Што замёрзла? Хто кусае? Што баліць у цябе? Хто стогне? Хто сьпіць? Хто ходзіць па дзядзінцу? Што нёс падарожны? Хто зьбірае мёд? Што табе тата прывёз з кірмашу? Хто б'е камень? Што засыпваюць друзам? Ці бачыў ты шашу? Дзе?

Прыклад *Дождж ідзе. Вада замерзла.*

Практыкаваньне 33.

Настуліна казка.

Настуля гаворыць сваёй маме.

— Мама, любіш ты слухаць казкі?

— Люблю, дзетачка.

— Можа хочаш, я табе раскажу казку.

— Скажы, я вельмі хачу паслухаць.

— А ці спадабаецца яна табе?

— Напэўна спадабаецца.

— Яна вельмі кароценькая.

— Ды ты кажы ўжо...

— Была сабе раз паліваная місачка і стаяла яна на стале, а я... неяк зачапіла, дык яна ўзяла і пабілася.

(З «Беларускае Школы» К. Е.)

1. У каго была паліваная місачка? Дзе яна стаяла? Ці місачка магла сама разьбіцца? Хто разьбіў яе? Чаму Настуля не сказала гэтага маме проста? Што прыдумала Настуля? Ці мама будзе гневацца на Настулю? Чаму?

Памагаю бацьку.



2. Напішэце па кожнаму малюнку, што робіць бацька і сын.

3. *Упісаць патрэбныя словы.* Пастух... статак. Вецер.. яблыню. У лесе .. грыбы. Пастухі... ваўка. Мышы... збожжа. Конь... атосу. Падарожны.. люльку. Рабочы.. пры станку. Дажджом... дарогу. Сабака... за катом.

Прыклад. *Пастух пасе статак.*

Практыкаваньне 34.



1. Выпісаць паасобку.—

шавецкія прылады:... кавальскія прылады:...
рыбалоўныя прылады:... хатнія рэчы і прылады:...

2. *Напішэце ў множным ліку.* Вучань вучыцца. Птушка пяе. Купец гандлюе. Шуляк ляціць. Сьлімак паўзе. Касец адпачывае. Драбіна паламалася. Дыван вісіць. Звон гудзіць. Жанчына тчэ. Казьляня скача. Дзіця перапалохалася.

Прыклад.

Вучні вучацца. Птушкі пяюць.

3. Намалюй ліхтара і молата.

Практыкаваньне 35.

Спрытныя пацукі.

1. Напішэце папарадку кароткімі сказамі, што бачыце на гэтых малюнках.

2. *Напісаць у адзіночным ліку.* Вазёры шумяць. Вераб'і цьвіркаюць. Ластаўкі лётаюць. Воблакі пацямнелі. Вёскі зьбяднелі. Коні ўцяклі. Дзеці гуляюць. Качаняты плаваюць. Плытнікі замарыліся. Чыркі паляцелі. Жанчыны сьпяваюць. Людзі адпачываюць.

Прыклад. Возера шуміць.

Практыкаваньне 36.

1. *Дапісаць сказы на пытаньні: што рабілі? што зрабілі?*
Гаспадар з сынам капалі бульбу. Майстар і чаляднік паехалі за таварам. Дзесятнік і рабочыя... Машыністы і качагар... Цесьць і прымак... Доктар з фэльчарам... Гаспадыня і яе госьцейка... І старыя і малыя... Цыган і жыд... Сымон, Юрка і Тодар... Алёна і Марыся...

2. *Паставіць дзейнік і выказьнік у множным ліку.* Рабочы выходзіць на працу. Парабак запрагае коняў. Кніжка зацікавіла вучняў. Жаўранак пяе звонкую песьню. Мыш уцякае ад ката ў нару. Воўк задушыў некалькі авечак. Лес, балота была навакол. Пакасілася хата, пакасіўся і хлеў ад старасьці.

3. ЗАГАДКА. Два кальцы, два канцы, а пасярэдзіне цьвік.

Практыкаваньне 37.

Сьляпец (гульня).

Сьцяпанку завязалі хусткай вочы. У руцэ ён трымае рамень. Навакол шмыгаюць хлапчукі і дзяўчаткі. Яны ціханька, на цыпках, мяняюць сваё мейсца. Сьцяпанка ходзіць, расставіўшы рукі, і стараецца дакрануцца каго рамнём. Калі дакранецца, тады той павінен піснуць або загудзець. Сьцяпанка прыслухоўваецца: па голасу павінен адгадаць, хто гудзіць. Калі ўгадае, яму адвяжуць вочы, а завяжуць таму, хто гудзеў. Калі не адгадае, доўга яшчэ будзе хадзіць з завязанымі вачыма.

1. Напісаць адказы. Як завецца гульня? Хто гуляе? Каму завязалі вочы? Што Сьцяпанка трымае ў руках? Што ён павінен зрабіць? Калі дакранецца, каму завязваюць вочы?

2. Трэба ісьці ў школу. Зьбіраюся, іду (напісаць кароткімі сказамі, адно па адным, усе дзеяньні вучня. Наперад падумаць, вымавіць пра сябе кожны сказ, паправіць дзе патрэбна, і толькі тады пісаць).

3. Што тут намалёвана? Дзе сабраліся дзеці? Што робіць кожны з хлапцоў? Ці так гуляеце вы з таварышамі? Напішэце, як вы гуляеце ў «гарадкі» або «рухі».

Прыказка. Гулі не аднаго ў лапці абулі.

Практыкаваньне 38.



Напішэце, што бачыце на малюнках.

Практыкаваньне 39.

1. *Галасы жывёлы, птушак і казявак.*

Сабака брэша. Конь... Авечка... Варона...
Бусел... Гусак... Сьвіньня... Муха... Кот...
Карова... Зязюлька... Камар... Пчала...
Воўк... Верабей... Курыца... Конік...

Словы: Кракаць, ціўкаць, зьвінець, кукаваць, іржаць, кудактаць, мяўкаць, цьвіркаць, рохкаць, выць, зыкаць, гусьці.

2. Вечарам варочаецца статак з пашы: каровы.., авечкі... сьвіньні...

Практыкаваньне 40.

Хворы Белячок.

Любілі дзеці свайго сабачку Белячка. Усюды Белячок з імі. Заўсёды вясёлы, шчасьлівы. Заўсёды хвост у рабоце. Гуляе, скача, блізка што ня есьць і сьпіць разам з дзяцьмі.



Аднаго разу захварэў Белячок. Лёг каля хлява. Увесь дрыжыць. Вочы мутныя. Нос гарачы. Не адыходзяць дзеці ад Белячка. Перанясьлі яго ў гумно. Прыкрылі кажухом. Нічога ня есьць Белячок, толькі малака гарачага трошкі выпʻе. Ці не яно толькі і памагло? На трэці дзень Белячок зʻеў скарыначку хлеба. Яшчэ дзень і наш Белячок ужо і ўстаў, пачаў патроху ўсё есьці. Хутка ад хваробы не засталася і сьледу. Ізноў вясёлы і шчасьлівы ганяецца Белячок за сваімі таварышамі.

1. Напішэце адказы. Хто захварэў? Хто яго даглядаў? Куды дзеці перанясьлі Белячка? Чым прыкрылі яго? Што памагло Белячку? З кім ізноў гуляе Белячок?

2. Напішэце, як Лукаш прывітаў раніцай свайго таварыша Рабчыка?

3. Гульня ў сьнежкі.

Калі выпаў першы сьнег?
Куды ты выйшаў з хаты?
Хто ўжо гуляў у сьнежкі?
Што ты пачаў рабіць?
Куды папала табе сьнежкаю?
Ці кінуў ты гуляць?

4. ПРЫКАЗКА: Найгорш калі баішся: і ліха ня мінеш і надрыжышся.

5. ЗАГАДКА: Сядзіць на даху і люльку курыць.

Практыкаваньне 41.

1. *Сьпішэце ўласныя іменьні.*

Беларусь. Вільня. Менск. Горадня. Рака Нёман. Белавеская пушча. Наваградак. Возера Нарач. Рака Дняпро. Полаччына.

Польшча. Варшава Лодзь. Рака Вісла. — Латвія Дзьвінск. Рака Заходняя Дзьвіна.

Беларускія іменьні.

Раман. Сымон. Якуб. Барыс. Пранук. Янка. Кацярына Ганна. Волыа. Альжбэта. Крыстына. Марыся.

Іменьні жывёлы.

Курта. Лыска. Рабчык. Бельчык. Норка. — Васька. Мурка. Кіса. Мурза. — Красуля. Зязюля. Рагуля. Рабая. Пярэстая. — Буланчык. Сіўка. Каштанка.



2. *Адказаць на пытаньні* Дзе стаіць вятрак? Колькі мае крыльляў? Хто працуе ў вятраку? Што мельнік робіць?

Калі вятрак бывае ў рабоце? Дзе будуюць вадзяныя млыны, а дзе вятракі?

3. *Бацька паехаў да млына.* Што ён робіць зьбіраючыся да млына і ў самым млыне? Напісаць папарадку ўсе яго дзеяньні кароткімі сказамі.

4. ПРЫКАЗКІ. У Слуцку ўсё па людзку.—Майстар з Міра: што цяў, то дзіра.

5. ЗАГАДКА. Крыльлямі махае, а ляцець ня можа.

Практыкаваньне 42.

Які? Якая? Якое?

1. На гэтыя пытаньні напішэце, якія асаблівасьці маюць наступныя рэчы.



Прыклад.

Хата дзеравянная. Дом каменны.

2. *Напішэце, якія ПА КОЛЕРУ ўсе наступныя рэчы і істоты.* Жук. Крук. Салавей. Трава. Валошка. Мак. Незабудка. Браткі. Лісічкі. Малако. Мёд. Кроў. Сьнег. Сажа.

Попел. Вугаль. Пясок. Золата. Хмара. Сярмяга. Істужка.

Прыклад. Жук чорны.

3. Якога колеру бываюць каровы? авечкі? куры? грыбы?

Практыкаваньне 43.

На Колядах.

Пранук і Антось убраліся ў новыя сьвяточныя кашулі. Сяньня Коляды. Бацька нясе з клеці торбачку гарэхаў. Па поўных прыгоршчах дае Антасю і Прануку. Хлапцы насыпалі поўныя кішані і пабеглі да Міхалкавых.

— Што тваё? — загадвае Пранук Міхалкаваму Пятрусю.

— Лішка! — кажа Пятрусь.

— Раз, два, тры... лічаць гарэхі ў Пранукавай жмені.

— Цотка! Цотка! Не ўгадаў! — крычыць задаволены Пранук. Пятрусь аддае жменьку гарэхаў Прануку і сам загадвае Антосю.

Загадваюць адзін аднаму, лушчаць і ядуць гарэхі. Хутка ня мелі чым і загадваць — зьелі ўсе гарэхі. Антось з Пранукам пайшлі да хаты прасіць у бацькі больш гарэхаў.

1. *Напішэце поўныя адказы на пытаньні.* Пра якое сьвята тут апавядаецца? Чаго бацька даў хлапцам? Да каго яны пайшлі гуляць? Хто каму прайграў? Калі спынілася гульня?

2. Напішэце кароткімі сказамі, у што гуляюць на вёсцы Колядамі.

Практыкаваньне 44.

1. *Напішэце, якія ўсе гэтыя рэчы і істоты.*—

а) *па смаку:* рэдзька, хрэн, ігруша, селядзец, воцат, квас, хіна...

б) *па вялічыні ці росту:* конь і кот, дзерава і куст, гарбуз і яблыка, бочка і шклянка, параход і човен, вежа і хата...

в) *па форме:* серп, мячык, печ, падлога, рэпа, морква, лісты дрэў, вужака, яйцо, месяц...

Прыклад: серп паўкруглы.

г) *па матар'ялу:* засланка, супонь, сякера, грэбень, сьвечка, вяроўка, лапаць, шляя, гаршчо , дзяжа, сподак, лыжка, мост...

д) *па вазе і шчыльнасьці:* камень, пух, сьнег, лёд, мох, дуб, вугаль, жалеза, сена...

Некаторыя з патрэбных тут слоў: *прэсны, суконны, жалезны, простакутны, шчыльны, гумовы, скураны, пухлявы* (*пухкі*), *ільняны, ваўняны, зубчасты, кантаваты, шаўковы, прадоўжны, вялізарны, лапчаты, перкаваты, плоскі, наздраваты, губкаваты...*

2. Напішэце, якога росту бываюць людзі.
3. Напішэце, якія бываюць істужкі па колеру і матар'ялу.

Практыкаваньне 45.

Нядбалы вучань.



1. Напішэце кароткімі сказамі, што бачыце на кожным з гэтых малюнкаў.

2. Якімі бываюць *па цяплыні* лёд? вар? сьнег? дождж? агонь? гарбата? град? кроў?

Практыкаваньне 46.

1. *Дадаць прыметы да слоў:* дошка, лаўкі, крэсла, шафа, кніжкі, лінейка, губка, крэйда, сьцірка, чарнілка, пяро, карандаш, папера, сшыткі... Дзе знаходзяцца ўсе гэтыя рэчы?

2. *Дапісаць.* Бурак чырвоны, а рэдзька... Рунь зялёная, а сьпелае жыта... Верабей шэры, а крук... Гарбуз круглы, а гурок... Воск мяккі, а жалеза... Лёд цьвёрды, а сьнег... Каса вострая, а лапата... Лінейка простая, а серп... Загоны шырокія, а разоры... Дзед стары, а ўнук... Заяц прастацкі, а ліс...

ЗАГАДКА. Чырвоны колер, вінны смак, а каменнае сэрца — што гэта так?

Практыкаваньне 47.

Верабейка.

Прынёс яго бацька ў жмені, а быў ён скурчаны і зьмерзлы. З холаду і голаду ня мог лётаць і даваўся лавіць рукою. Цяпер ён лётае пад стольлю і вясёла цьвіркае. Калі мы ямо, ён сядзе на край міскі і пазірае ў яе чорнымі, як пацёркі, вочкамі і цьвіркае: цьвірк! цьвірк! і так сьмешна, што кожны мусіць расьсьмяяцца.

Прышла вясна. Аднаго дня кажа мама:

—Трэба верабейчыка выпусьціць на двор.

Тры дні хадзілі дзеці сумныя і ледзь ня плакалі, хоць і зналі, што на волі штушцы будзе лепш. Чацьвёртага дня наш верабейчык ужо лётаў з іншымі па дзеравах. Аднаго разу пад вечар прыляцеў наш верабейчык, сеў на вакне і пасвойму зацьвіркаў, быццам хацеў сказаць, што ён галодны.

Якая-ж то была для дзяцей пацеха!

Адказаць на пытаньні. Хто прынёс дзецям верабейку? Які быў верабейка? Дзе верабейка жыў цэлую зіму? Ці добра яму была ў хаце? Калі яго выпусьцілі на волю? Ці ляпей яму была на волі? Ці забыўся ён сваіх прыяцяляў?

Практыкаванне 48.

1. *Прыпісаць назовы прадметаў.* Кіслы... Старое... Дубовы... Зімняя... Сасновае... Круглы... Новы... Зялёнае... Вучнёўская... Брудны... Прасяная... Лісься... Раньняе... Белае... Густы... Марудны... Рабы... Бярозавая...

2. Падпішэце, якія гэта кветкі.

3. Якія ведаеце кветкі чырвоныя? сінія? белыя? жоўтыя?

Прыклад. *Жоўтыя кветкі: курасьлеп, юрыня...*

4. *Пастухі гоняць быдла на пашу.* Напісаць папарадку, што яны робяць ўдома і па дарозе.

Пастухі устаюць рана. Апранаюцца. Бяруць хлеба. Выходзяць на панадворак. Адчыняюць хлеў.

5. З ячменю мякіна атрымліваецца *ячменная.*
З жыта .....
З аўса .....

6. ЗАГАДКА: Поўна цэркаўка людзей, а ні вокан, ні дзьвярэй.

Практыкаваньне 49.



Напішэце, што бачыце на малюнках і прыдумайце да напісанага загаловак.

2. Першы раз у школу.

Хто павёў цябе ў школу?
Хто спаткаў вас у школе?
Аб чым запыталася вучыцелька?
Калі пачалося вучэньне?
Якія рэчы купіў табе тата для школы?
Ці хацелася табе вучыцца?

3. *Дапісаць.* Летам у нас кароткія ночы і даўгія дні, а зімою...

4. *Замяніць адным словам.*

Лапата з жалеза...
Нажніцы з сталі...
Скаварада з чыгуна...
Куля з волава...
Самавар з медзі...

Пярсьцёнак з золата...
Бочка з дуба...
Гузік з косьці...
Шапка з сукна...
Спадніца з воўны...

Прыклад. Лапата жалезная.

5. ПРЫКАЗКА. Белае поле, чорнае насеньне, адзін сее, а ўсе разумеюць.

6. ЗАГАДКА. Маю рогі, маю ногі,
Як багаты, так убогі
Ля мяне ўсе сядаюць, —
Дык скажы — як называюць?

7. Намалюй лапату, нажніцы і брыль.

Практыкаваньне 50.

1. *Па дадзеных вузорах зьмяніць словы, якія азначаюць асаблівасьці прадметаў.*

Родны дзядзька.	Родная цётка.	Роднае дзіця.
Шырокі бурнос.	Шырокая коўдра.	Шырокае радно.
Сярэдні гак.	Сярэдняя адмычка.	Сярэдняе кола.
Худы баран.	Худ... авечка.	Худ... ягня.
Сіні сшыток.	Сін... папера.	Сін... чарніла.
Гніл... зруб.	Гнілая жэрдка.	Гніл... бервяно.
Асінав... кол.	Асінавая дошка.	Асінав... карыта.
Глінян... гаршчок.	Глінян... міска.	Глінянае начыньне.
Нов... валак.	Нов... трапачка.	Новае сіта.
Раньн... ўсход.	Раньн... раса.	Раньняе жыта.

2. Напішэце, якія гэта кветкі.

3. Якім колерам цьвітуць агуркі? бэз? ігруша?

4. *Тата зьбіраецца гараць.* Што ён робіць перад гэтым і прыехаўшы на ральлю? Напісаць папарадку ўсе яго дзеяньні кароткімі сказамі.

Прыклад.

Бацька ладзіць плуг. Вывозіць калёсы.
Дае каню аўса. Сьнедае. Запрагае каня.

Практыкаваньне 51.

Бобік.

Усе дзеці ведалі Бобіка. Ніводзін сабака ня ўмеў так «служыць», як Бобік. Янка доўга яго муштраваў, пакуль вывучыў. Толькі пакажа Бобіку кавалак хлеба ці мяса, зараз Бобік падбяжыць, закруціць хвастком і стане на заднія лапкі, як кажуць, «дубка». Стаіць доўга, пазірае хлапцу ў вочы, быццам просіць: «дай хлеба, дай!» Нарэшце Янка клаў хлеб, але ня ў лапкі, а на нос Бобіку. Як толькі Янка адымаў руку, Бобік падкідваў носам хлеб угару і, разьзявіўшы мордачку, лавіў яго ў паветры і еў.

— Вось які разумны,—гаварылі разыходзячыся дзеці.



1. *Напісаць адказы.* У каго быў Бобік? Чаму Янка вывучыў Бобіка? Што Янка клаў Бобіку на нос? Як служыў Бобік? Ці Бобік браў хлеб адразу? Чаго ён чакаў? Што дзеці гаварылі пра Бобіка?

2. *Дадаць прыметы.* Мурашка... Пчала... Тхор... Казёл... Ліс... Зьмяя... Яшчарка... Качаня... Пугач... Кажан... Лямех... Шуфаль... Шворан... Акяніца... Газоўка... Халява... Аўчына... Кужаль... Зрэб'е... Кажух... Шалік... Дзяўчына... Песьня... Сонейка... Месяц... Неба...

Практыкаваньне 52.

1. У Алесі і Пятрука была маленькая сястра Прузына. Яшчэ ў калысцы. Матка пайшла да суседзяў. Дзяцей прасіла забаўляць Прузынку. Як яны яе забаўлялі? Напішэце.

2. Напісаць кароткае апавяданьне на тэму: «Якое здарэньне сталася аднаго разу з зайчыкам?».

3. *Хачу зрабіць сьвісьцёлку.* Што і што я павінен зрабіць? Напісаць папарадку ўсе дзеяньні кароткімі сказамі.

4. ПРЫКАЗКА. Ня зыч ліха другому, каб не давялося самому.

Практыкаваньне 53.



1. Напішэце, што бачыце на кожным малюнку і прыдумайце да напісанага загаловак.

2. *Зьмяніць з адзіночнага ў множны лік.*

Тупы нож.	Тупыя нажы.
Рагаты казёл.	Рагатыя казлы
Рагатая каза.	Рагатыя козы.
Сталёвая піла.	Сталёв... піл...
Тонкая сьцяна.	Тонк... сьцен...
Стары хлеў.	. . . . .
Маленькае люстэрка.	. . . . .
Лішні чалавек.	. . . . .

3. Па панадворку хадзіла сьвіньня з парасятамі. Сьвіньня была ўродная, сытая, белая, чыстая, спакойная, паважная. Парасяты былі падобныя да маткі. Напішэце, якія былі парасяты.

ЗАГАДКА. Ня хворая, а ўсё стогне; ня згубіла нічога, а ўсё шукае.

Практыкаваньне 54.

Хітрая лісіца.

Занадзілася лісіца ў куратнік лазіць. Падкапала ў падмуроўцы дзюрку і выцягнула некалькі курыц. — Я-ж цябе, зладзейку, навучу, як курэй красьці!—кажа гаспадар. Зрабіў ён з тонкае моцнае вяровачкі пятлю і прыладзіў над дзюрай ў падмуроўцы.

Назаўтра — бачыць — ляжыць лісіца, выцягнуўшыся, як няжывая. Штурхануў яе нагой, перакуліў на другі бок — ня кратаецца лісіца!

— Задушылася,—думае гаспадар.

Зьняў лісіцу з пятлі і хацеў цягнуць за хвост у сені зьдзіраць скуру. Аж раптам—як скочыць лісіца! Селянін на'т і не апамятаваўся, як лісіца была ўжо далёка на ўзгорку.

— Дурань я, дурань! думае селянін. Гэта ж яна толькі прыкінулася няжывой, а я, дурны, і ня ўцяміў!

Так ашукала хітрая лісіца чалавека.

1. *Напісаць адказы на пытаньні.* Куды занадзілася лазіць лісіца? Што прыдумаў на яе гаспадар? Ці папалася лісіца ў пятлю? Што падумаў гаспадар, убачыўшы яе? Што ён зрабіў? Пашто ён зьняў лісіцу з пятлі? Што ў гэты момант сталася? Ці магло быць так узапраўды? Прыпомніце, ці не расказваў хто падобнага здарэньня. Напішэце.

2. *Чый? чыя? чые?*

Будка сабакі.	Сабачая будка.
Нара мышы.	Мышыная нара.
Капыта асла.	. . . . .
Рыла сьвіньні.	. . . . .
Гняздо бусла.	. . . . .
Торба жабрака.	. . . . .
Вопратка жанчыны.	. . . . .
Хустка дзяўчыны.	. . . . .

3. ПРЫКАЗКА. Бачыць вока, дзе пячэцца кока.

Практыкаваньне 55.

1. *Суседняя вёска.* Як называецца бліжэйшая суседняя вёска? Колькі да яе кілямэтраў? Якая да яе дарога? Ці вялікая гэтая вёска? Ці ёсьць блізка ля яе лес? рэчка? Да каго туды ходзіш? Што там робіце? Якая болей падабаецца табе вёска: свая ці гэта суседняя?

Бел. Чырв. Крыж.

2. ПРЫКАЗКІ: Мілей свая хатка, як чужая вёска.—Не бяда, што чорна, абы была праворна.

3. Спраўны і нядбалы вучань.

Спраўны вучань ніколі, ня позьніцца ў школу, ходзіць заўсёды чысты, мае ў кішані хустку да носа, пасьля кожнае

працы мые рукі, калі уваходзіць у школу — выцірае ногі, заўсёды ветлівы і ўважны, кніжкі і сшыткі свае абкладвае паперaю.

Нядбалы вучань часта позьніцца, а то і зусім ня прыходзіць у школу . . . . . .

(Перапісаць гэтае апавяданьне і дакончыць яго).

4. *Малады, стары, хворы, дужы, здаровы, разумны, добры, гультайны (ляны), далікатны, старанны, спрытны, прыожы, марудны, таварыскі, спагадлівы, працавіты, ахайны.*

Якім бы ты хацеў быць?
Які твой дзед?

Якая твая сястра?
Які твой таварыш?

Практыкаваньне 56.

1. *Прыпісаць некалькі асабліваcьцяў.*
Кісель журавінавы, салодкі, чырвоны.
Самавар круглы, жоўты, мядзяны.
Дым едкі, чорны, густы.
Тытун... Цыбуля... Хлеб... Каша... Масла... Даёнка... Ступа... Андарак... Хвартух... Кабыла...



2. Напішэце, што бачыце на малюнках і прыдумайце да напісанага загаловак.

Палачка-стукалачка (гульня).

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Ідзе палачка шукаць.
Каго першага знайдзе,
Той за палачкай пайдзе!—

Так пяець Кастусь, адвярнуўшыся тварам да сьцяны. Янка, Міхась і Аўген хаваюцца хто пад брамаю, хто на ганку, хто за вуглом хаты. Кожны асьцярожненька пазірае, куды пойдзе Кастусь. Палачку ён палажыў на ўмоўленае

месца. Хочацца хлопцам украсьці палачку. Кастусь, пазіраючы на ўсе бакі, ідзе шукаць хлапцоў. Заўважыў Аўгена.— Раз, два, тры! крычыць і стукае Кастусь.—Выходзь, Аўген.— Прыдзецца Аўгену пільнаваць палачку.—Міхась праз дзірачку ў ганку ўсё бачыць. Дапільнаваў, калі Аўген адышоўся да брамы і скок да палачкі!—Раз, два, тры!—крычыць. Палачка ўкрадзена.—Вылазіць з-пад варот і Янка. Яны зноў хаваюцца. Кастусь яшчэ раз пяе: раз, два, тры! — На гэты раз ён дапільнуе палачку-стукалачку.

3. *Адказаць на пытаньні:* Як завецца гульня? Хто гуляе? Хто сьцеражэць палачку-стукалачку? Каго першага заўважыў Кастусь? Каму ўжо прыдзецца пільнаваць палачку? Ці доўга так гулялі хлапчукі?

Практыкаваньне 57.

1. На бацькаўшчыну!



Якія птушачкі намалёваны тут? Што яны тут робяць? На чым сядзяць? Скуль і куды лятуць? Якая стаіць пара году? Што іх пагнала восеньню з бацькаўшчыны ў вырай? Ці вілі яны гнёзды ў цёплых краёх? Ці сьпявалі там песьні? Дзе яны будуць выводзіць сваіх дзетак? Як спаткаюць іх на бацькаўшчыне?

2. *Напішэце адказы на пытаньні.*

Што шырокае? Што таўстое? Што цьвёрдае? Што густое? Што лёгкае? Што вострае? Што гладкое? Што рэдкае? Што

вузкае? Што высокае? Што кароткае? Што вялікае? Што шчыльнае? Што простае? Што крывое? Што малое? Што рабое? Што нізкое? Што тонкае? Што гібкае?

3. Якія бываюць у людзей па колеру вочы? валасы?

4. Два суседы.

У адным месце жылі два суседы. Дзеці аднаго былі сытыя, здаровыя, румяныя, вясёлыя, жвавыя, рухавыя. Дзеці другога былі зусім інакшыя. Напісаць, якія яны былі.

5. Што робяць сякераю? долатом? напільнікам? рэшатам? вяроўкамі? абцугамі? машынамі?

Прыклад. *Сякераю рубаюць і струганць.*

Практыкаваньне 58.

Хто рабіў пятлю? Каго хлопчык зьбіраўся лавіць? Дзе паставіў ён пятлю? Чаго насыпаў там? Якая птушачка папалася ў пятлю? Што з ёю зрабілася? Ці шкадаваў хлопчык птушачку? Што ён зрабіў з пятлёю? Ці будзе болей ставіць петлі? Хто яшчэ шкадуе птушачку?

Практыкаваньне 59.

1. *Дадаць прыметы.* Мухамор і паганка... Елка і сасна... Клён і асіна... Жыта і пшаніца... Бурак і морква... Маліна і смародзіна... Карова і сьвіньня... Вавёрка і тхор... Пава

і індык... Гілі і сінякі... Чапяла і памяло... Лявоніха і Юрка...

Прыклад. ***Мухамор і паганка—атрутныя грыбы.***

2. *Дапісаць.* Сьвіньня рабая і парасяты... Каза бязрогая і казьляты... гаспадар нядбалы і гаспадарка... Майстар старанны, дык і работа...

3. Аб чым запыталася маці, калі Алеся вярнулася аднаго разу са школы?

4. *Гаспадыня пячэ хлеб.* Што яна тады робіць? Напішэце папарадку ўсе яе дзеяньні кароткімі сказамі.

5. ЗАГАДКА. Рыечка рые, а скачка шчабеча.

Практыкаваньне 60.

1. *Як рухаюцца жывыя істоты.* Чалавек... Конь... Рыба... Чарвяк.. Птушка... Вужака... Конік... Вол... Матыль...

А качка? верабей? бусел? гусак?



2. *Напішэце:* дзе выткаў павук сваё павучэньне? Дзе ён сам сядзіць? Чаму ён там сядзіць? Да чаго прывесіўся другі павук? Чым жывяцца павукі?

3. Горды гусак.

Плаваець па сажаўцы гусак і ў голас размаўляе сам з сабою. — «Як я да ўсяго здатны: і па вадзе плаваю, і па зямлі хаджу, і лётаць умею. Пэўне, няма другой такой птушкі на сьвеце, — я за ўсіх лепшы».

Падслухала гусака чапля і сьмяецца з яго. — «Дурны ты, гусак! Ціж можаш ты плаваць, як шчупак, лётаць, як арол і бегаць, як алень? Ляпей ведаць добра што — небудзь адно, чымся шмат чаго, але ўсё блага». *(Р. К.)*

4. Напісаць, хто найлепш плавае? лётае? бегае?

5. ЗАГАДКА. В сіць сіта, ня рукамі зьвіта.

Практыкаваньне 61.

1. *Дапісаць.*

Людзі ходзяць, а птушкі .....
Вужакі поўзаюць, а рыбы .....
Зайцы ....., а чарвякі .....
Гусяняткі ....., а ластаўкі .....

Кот мяўкае, а сабака... Конь іржэць, а карова... Мыш пішчыць, а жук... Мядзьведзь раве, а воўк... Курыца сакоча, а варона... Зязюля..., а жаба...

Сена косяць, а жыта... Ніткі прадуць, а палатно... Пясок сыплюць, а ваду... Бульбу садзяць, а ячмень...

Дармаед (байка).

Убачыла мыш зморанага цяжкай працай каня і пачала сьмяяцца з яго.

— Дурань ты, дурань! — кажа мыш, — працуеш кожны дзень да поту, а што маеш за гэта? Кошык сена ды калі-некалі

гарчык аўса! Вось маё дык жыцьцё! Не чакаю гаспадаровае ласкі. Забяруся ў сьвіран і ем, колькі хачу, найлепшага зерня.

Загаварылася мыш і не заўважыла, як ціханька падкраўся кот і хоп мышку лапамі!



Запішчэла, заенчыла мышка... просіць каня на ратунак.

— Гультаі і дармаеды на гэта толькі і заслугоўваюць, — адказаў конь, і не перашкодзіў кату расправіцца з мышкаю.

2. *Напісаць адказы.* Хто цяжка працуе? Што конь мае за сваю працу? Ці працуе мышка? Чым яна жывіцца? Як была яна пакарана за гультайства? Чаму конь не бараніў мышку ад ката?

Практыкаваньне 62.

1. *Хто што робіць?*

Што робіць садоўнік? пекар? прачка? пчаляр? гарбар? гароднік? дворнік? шкляр?

2. Якую карысьць прыносяць гаспадару вол? конь? сабака? каза? трус?

3. Якія рэчы выраблюць з дзерава? жалеза? медзі? гліны? шкла?

Прыклад. *З медзі выраблюць званы, начыньне і дрот для тэлефонных правадоў.*

4. Каб памаляваць вокны, дзьверы і падлогу, каго трэба паклікаць? А каго трэба паклікаць, каб паправіць печку? замка? набіць балею? паставіць зруб хаты?

Практыкаваньне 63.

1. Вожык.

Дзе ты ўбачыў вожыка? ці можна ўзяць яго рукамі? Чаму? Як жа ты ўзяў яго? Куды прынёс? Чым карміў? Чым вожык карысны ў хаце?

2. Антось і Рыгорка пайшлі да сваіх таварышоў па кніжкі. Па дарозе бачаць — сабралася на вуліцы грамада людзей. Яны падыйшлі бліжэй і ўбачылі... (закончыць гэтае апавяданьне і прыдумаць да яго загаловак).

3. Раніцай будзіла маці сваю пястунку Настулю Што яна ёй гаварыла? А што адказала Настуля?

4. ПРЫКАЗКА. Што міру, то і бабінаму сыну.

Практыкаваньне 64.

1. *Адказаць на пытаньні.* Што ты любіш рабіць? Чаго ня любіш рабіць? Чаму хацеў бы навучыцца? Што умее рабіць Міхась? Лаўрын? Вольга?

У якой рабоце памагаеш ты бацьку? У якой рабоце Антолька і Надзея памагаюць сваёй маці?

Што ўмее рабіць смаляр? бляхар? машыніст? каморнік? аграном? мантэр?

На вышэй пастаўленыя пытаньні прыдумай свае адказы, але можна выкарыстаць і некаторыя з наступных слоў: *стругаць, маляваць, плясьці кошыкі, зьбіраць грыбы, адгадваць загадкі, ткаць на кроснах, гнаць смалу, выпальваць цэглу, граць на дудцы, калядаваць, выраблять скуры, коўзацца, мерыць землю, паляпшаць гаспадарку, кіраваць машынаю, папраўляць электрыку...*

2. ПРЫКАЗКІ. Дзела майстра баіцца. — На сьвеце так бывае: хто працуе, той і мае.

Практыкаванне 65.

1. Напішэце кароткімі сказамі, што бачыце на кожным з гэтых малюнкаў і прыдумайце да ўсяго напісанага загаловак.

2. Прыдумайце, што магло здарыцца з хлапцом, калі ён панёс палудзень для бацькі.

3. Кажа бацька Міколцы: „бяжы, сынок, пашукай вуздэчку і лейцы. Учора дзесьці закінуў“. Прыляцеў Міколка ў гумно, шукае, шукае — няма. Бяжыць...

(закончыць гэтае апавяданьне).

Практыкаваньне 66.

Янукова стада.

Пастушок Янук вельмі любіў сваё стада. Ніколі ён ня сьцёбаў дарэмна сваіх каровак, авечак, хіба пойдзе каторая ў шкоду. Але пакараная ня гневалася. Сама чулася вінаватаю.

Пасьвіў Янук заўсёды на адным мейсцы, блізка лесу. Часта стуль выбягаў воўк, каб схапіць каторую авечку. Але

Б. Ч. К.

Янук адважна кідаўся на ваўка; крычаў, гукаў і праганяў ваўка.

Зазлаваў воўк на Янука. Аднаго разу, выбегшы з лесу, кінуўся ён раптам на Янука. Убачыла гэта Янукова стада і давай хутчэй ратаваць свайго павадыра. Падбег бык Мікіта, дый як дасьць ваўку ў бок рагамі! Ледзь - ледзь вырваўся воўк з бяды.

1. На гэты ўзор напішэце свае здарэньні, якія ведаеце.

2. Цераз вёску праехалі цыганы. Як пасьля таго стары дзед Раман палохаў жэўжыка Саўку, калі той не пераставаў дурэць?

Практыкаваньне 67.

1. Пятрук расказвае сам аб сабе (адным): *я ўстаю рана, (я) апранаюся, (я) сьнедаю, (я) зьбіраю кнігі, (я) іду ў школу, (я) пішу...*

Дапісаць, як Пятрук тое самае расказваў-бы пра сябе і сваіх братоў ці таварышоў:

Прыклад. *Мы устаем рана, (мы) апранаемся, (мы) пішам...*

2. Пятрук кажа (аднаму) Кастусю: «я ведаю, што ты робіш кожны дзень: *ты пасеш скаціну, (ты) пляцеш кошыкі, (ты) сьнедаеш, потым (ты) памагаеш бацьку, (ты) капаеш на агародзе бульбу, вечарам (ты) гуляеш з таварышамі, а павячэраўшы яшчэ (ты) пішаш і (ты) чытаеш кнігу»...*

Дапісаць, як тое самое Пятрук сказаў-бы Кастусю і яшчэ каму-колечы з яго братоў ці таварышоў.

Прыклад: *вы пасеце, (вы) пляцеце...*



3. Пятрук расказвае пра аднаго Сьцяпана або адну Ганулю: *зраньня (ён-яна) едзе ў поле, (ён-яна) памагае бацьку, потым (ён-яна) палуднае, самым вечарам (ён-яна) чытае і піша...*

Дапісаць, як Пятрук расказваў-бы тое самае пра некалькіх асобаў.

Прыклад. *Зраньня яны працуюць, (яны) едуць у поле, (яны) памагаюць...*

4. Печ.

Дзе ставіцца печ? Хто складвае печ? З чаго складваецца печ? З чаго і дзе робіцца цэгла? Чым беляць печ? Чым паляць у печы? Што варыць у печы? а што пякуць у печы? Куды выходзіць дым з печы? Чым зачыняюць коміна? Чым выграбаюць жар з печы? Нашто патрэбны падпечак? Што стаяць на прыпечку?

Практыкаваньне 68.

1. Квактуха — сакатуха вадзіла малых куранятак. Воддаль паказаўся шуляк. Чаго яму тут трэба? Што робіць курыца? Ці слухаюць яе дзеткі? Куды яны схаваюцца?



Працавітая Зоська.

Зосьцы яшчэ толькі дванаццаты гадок, а яна ўжо гаспадыня ў хаце.

— Уставай, дачушка! жані быдла ў поле, — чуць дзень будзіць Зоську мама.

Зосьцы хочацца спаць, але яна хутка ўстае і бяжыць у хлеў выганяць каровак і авечак.

Вярнулася Зоська з пашы. Усе ўжо пасьнедалі і выйшлі на працу. Маці ня прыдзе да вечара — Зоська павінна замяніць яе ў хаце. Яна хутка сьнедае, прыбірае начыньне, мяце хату. Сьпяшаецца, пакуль не прачнуўся яе двохгадовы браток Косьця. Але вось і ён закратаўся ў калысцы. Мухі— злыдні не даюць яму спаць. Накарміла Зоська Косьцю, прыбрала яго пасьцельку і, як тая курачка з куранятамі, вядзецца з ім у гарод. Назьбірала брату красачак. Косьцік бавіцца, а Зоська скубе макрыцу і асот для сьвіней. Пакуль назьбірае, насячэ карыта — глядзіш і паўдзён ужо. Корміць Косьціка, палуднае сама і, замкнуўшы хату, з кошыкам ідзе капаць бульбу.

Вось і вечар на дварэ. Зоська спатыкае авечак з поля, заганяе ў хлеў, выносіць сьвіням ахрап'е. Кароў падоіць мама — Зоська яшчэ ня ўмее. Косьцік плача — захацеў спаць. Напаіла яго Зоська малаком і палажыла ў калыску. Пакалыхала крыху — заснуў Косьцік.

Цямнее. З поля прышла маці, бачыць — у Зоські ўсё зроблена, усё ў парадку. Цалуе Зоську, гладзіць яе па галоўцы. — Памочніца мая, кажа, — гаротніца! Чакай, куплю за тое табе новую сукенку.

Прыемныя для Зоські маміныя пяшчоты. Хутка заснула Зоська. Адпачне, а заўтра ізноў з сонейкам за працу.

2. Напішэпе, якую працу робіць Зоська ў працягу дня.

Практыкаваньне 69.

1. Напішэце, што бачыце на кожным з гэтых малюнкаў і прыдумайце да напісанага загаловак.

2. *Напісаць поўныя адказы на пытаньні. Учора* які быў дзень? *Сяньня* што робіць твая маці? *Заўтра* пойдзеш ты ў лес? *Сёлета* ці *летась* прыехала ў школу новая вучыцелька? *Летась* хадзіў ты ў школу? *Пазалетась* колькі табе была гадоў?

Практыкаваньне 70.

1. Вучыцель пытаецца ў Аўгена: «Чаму ты спозьніўся ў клясу? Што ты рабіў? Ці бацька ведае пра гэта? мо' ты яму памагаў у чым-колечы?» Што на ўсе гэтыя пытаньні адказаў Аўген?

2. А як вучыцель запытаўся бы пра гэта самае ў Прузыны? у некалькіх вучняў?

Напішэце пытаньні і адказы.

3. Ляжыць на пячы і дрэмлець муркаючы стары кот Васька. Пад лаўкай прабегла мыш. Васька ня чуе. Бачыць гэта стары дзед Тодар, які сядзіць каля стала, і кажа Васьцы... (закончыць гэтае апавяданьне).

Практыкаваньне 71.

Пакараная пыха.

Была сабе каза, вельмі важная і гордая. Яна гаварыла, што нікога не баіцца, нават каровы, бо мела вялікія і вострыя рогі. Аднаго разу выбегла каза на луг і бачыць — вялізарнае стада гусей пасецца. Ось будзе пацеха! — гаворыць каза. Пагналася каза за гусямі. Гусі ўцякаюць, крычаць, б'юць крыльлямі, гэгаюць... Ажно адзін гусак апамятаваўся і гаворыць:

—Як жа гэта так?—Яна адна, а нас столькі! Соромна ўцякаць. Давайце ўсе разам накінемся на яе: ге-ге-ге!

Гусі раптам павярнуліся і ўсе дружна накінуліся на казуню. Узьняўся крык, гармідар!

Каза зьдзівілася: так яшчэ ніколі з ёю не здаралася. Аж тут адна гуска хоп казу за ногу дый давай скубаць, другая за бараду ўчапілася, скубе, дзярэ, — трэцяя ў бок штурхае. Чырвоныя дзюбкі крычаць, скубуць, б'юць бедную казу — ратуйце!

Мэ-э-э! замэкала каза і наўцёкі! А гусі за ёю пагналіся. Ледзь-ледзь выратавалася каза з бяды. Ад таго разу прапала ўся казіная пыха.

Пытаньні. Чаму каза нікога не баялася? А яе баяліся? Ці ўзапраўды каза такая страшная? Куды аднаго разу выбегла каза? Што яна ўбачыла? Што зрабілася з гусямі? Хто іх застанавіў? Што гусак запрапанаваў усім? Ці паслухаліся гусі свайго павадыра? Што яны зрабілі? Чаму каза спачатку зьдзівілася? Што потым зрабіла? Ці пакінула пасьля таго казу яе пыха?

Практыкаваньне 72.

Узор. Я нічога ня *чытаю* (цяпер, зараз, сяньня).
Гэтае апавяданьне я ўжо *чытаў* (учора, раней, летась),
Гэта апавяданьне я *буду чытаць* ці *прачытаю* (заўтра, пасьля, у будучыні).

1. *Гледзячы на дадзены ўзор, напісаць, як сказаў-бы:*

вучыцель пра сваю працу
мельнік . . . . . у цяперашнім,
кравец . . . . . прошлым і бу-
маляр . . . . . дучным часе.
вучаніца пра сваё вучэньне
дзяўчына пра сваё прадзеньне

Прыклад. Я вучыў, я вучу, я буду вучыць.

Зарабіў...





2. Напішэце, што бачыце на кожным з гэтых малюнкаў. Калі хто прыпамінае з жыцьця падобнае здарэньне—напішэце.

Буслы.

У садочку, пры дарозе,
З даўных часаў на бярозе
Буслы завяліся.
Вельмі было дарагое
Ім гняздо сваё старое,—
На век з ім зжыліся.
Але людзі захацелі,
Каб то буслы пераселі
На другі бок саду;
Для таго слуп укапалі,
Барану прымацавалі,
Розную прыладу.
Тыя ж буслы больш цанілі
Гняздо, што дзяды зрабілі:
З ім не рассталіся —
Вельмі было дарагое,
Ім сваё гняздо старое,
На век з ім зжыліся.

(Родны Край).

1. *Пытаньні.* Ці лепш была бы буслам у новым гнязьдзе? Чаму-ж яны не хацелі перасесьці ў новае гняздо? Ці не прывыкае так да свайго «гнязда» і чалавек?

2. *Прыказкі.* Хата хаця і крывая, дык свая, радная. — Калі свайго хлеба край, то й пад хваінкай рай.

3. *Аб чым вы самі хацелі-б сяньня напісаць? Хай кожны прыдумае сабе якую-колечы тэму і напіша, вызначыўшы пытаньні і парадзіўшыся з вучыцялем. Можна і супольна цэлаю клясаю, пры дапамозе вучыцеля, апрацаваць адну якую тэму, па выбару вучняў, супольна жа вызначыўшы ўсе пытаньні. Пішэцце коратка, дакладна, абавязкава даючы у кожным сказе дзейнік і выказьнік.*

Практыкаваньне 74.



1. Напішэце, што бачыце на гэтых малюнках і прыдумайце да напісанага загаловак.

Мо‘ самі бачылі калі падобнае здарэньне — напішэце.

2. Паставіць выказьнік.

У цяперашнім часе.	*Мой дзень.* У колькі гадзін я ўстаю? Што я раблю спачатку? пасьля? Што робіць мама? Тэкля? Што я раблю па сьнеданьні? З кім і куды іду? Што мы там робім?
У прошлым часе.	*У лесе.* Куды пайшлі дзеці? Што яны рабілі ў лесе? Каго спалохаў Янка? Хто пагнаўся за зайцам? Чаго назьбіралі дзеці ў лесе? Чаго яшчэ назьбіралі дзяўчаты?
У будучным часе.	*Летам.* Што ты будзеш рабіць летам? У чым будзеш памагаць бацьку? Якія будзеш чытаць кнігі? Хто будуць летам твае таварышы? Калі ізноў пачнуцца заняткі ў школе?

Практыкаваньне 75.

Сьвяточная раніца ў вёсцы.

Нядзеля. Зараньня ўжо прадчуваецца сьвята. Яшчэ з вечара дзяўчаты чысьценька пазамяталі каля хат і на вуліцы і пасыпалі жоўценькім пясочкам ці аером. Устаюць пазьней, чым у будзень. Цішыня. Ласкава прыглядаецца сонейка да зморанай цяжкаю працаю вёскі. Ня чуваць звычайнага раньняга гоману, стуку-груку, беганіны-матаніны.

На ўсіх чыстая вопратка. У хлапцоў старанна вычышчаны боты: ажно гараць на сонцы. Дзеці добра вымытыя, зачэсаныя. Дзе-недзе на прызбах, з люлькамі ў зубах, сядзяць ужо суседзі — гаспадары і вядуць між сабою ціхую гутарку пра пакос, пра збожжа, пра гмінныя парадкі, пра цяжкія падаткі. Праз расчыненыя вокны хат нясецца дражнячы пах скварак, бліноў, каля якіх завіхаюцца руплівыя гаспадыні. Некалькі дзяўчат зьбегліся ўмовіцца, каб разам усім ісьці ў царкву. На іх чыстыя спадніцы, яскравыя кофты, крамныя чаравікі. З-пад прыгожых каляровых хустак выглядваюць такія-ж істужкі. Некаторыя дзяўчаты ў сукенках, зусім як тыя гарадзкія паненкі. Проста й не падыходзь!

Яшчэ часіна і вёска на палавіну апусьцела. Па дарозе да Сыцевіч цягнуцца невялічкімі групамі сяляне.

1. Выпісаць усё, па чым пазнаць, што вёска сьвяткуе.

2. Зіма. Траскучы мароз. Усё занесена сьнегам. На ўзьлесьсю спаткаліся тры зайчыкі. Што яны робяць? Якую-бы вы прыдумалі між імі размову (па прыкладу людзей)?

Школьная экскурсія.



З экскурсіі па вёсцы. Уважліва разглядзеце ўсё, што тут намалёвана. Якія пытаньні могуць паўстаць у вучняў, калі экскурсія застанавілася каля калодзежа? Вось некаторыя з пытаньняў: скуль набіраецца вада ў калодзежы? Якой глыбіні калодзеж? Параўнаць калодзежную і рачную ваду па чыстаце, цяплыні, смаку і мяккасьці. Якая вада здаравейшая? Чаму калодзеж трэба трымаць у чыстаце?

Практыкаваньне 77.

З экскурсіі па вёсцы.

Якія могуць паўстаць у вас пытаньні падчас экскурсіі па весцы? Абгаварыце з таварышамі і вучыцялем і напішэце адказы.

Апрача вашых, вось яшчэ некаторыя пытаньні. Не абавязкава, каб кожны вучань напісаў адказы на ўсе пытаньні. Хай кожны адкажа на некалькі пытаньняў (3 - 5), па свайму выбару і пры дапамозе вучыцеля, дзе трэба. Калі напішуць усе, тады трэба кожнаму прачытаць голасна перад цэлаю клясаю свае практыкаваньне, пры чым кожны адказ дакладна ўсімі абгаварваецца, пад кіраўніцтеам вучыцеля.

1. *Пытаньні.* Дзе пабудавалася вёска? Якое яе местапалажэньне? Колькі налічваецца ў вёсцы гаспадароў? Колькі жыхароў? асобна мужчын, жанчын і дзяцей? — Якія будынкі ёсьць у гаспадароў? Якое прызначэньне ў гаспадарцы маюць гумно, сьвіран, пуня, хлеў? Ці ўжываюцца сялянамі якія-колечы гаспадарскія машыны? Ці ўраджайную вёска мае землю? А якую землю маюць суседнія вёскі? Якое збожжа вашыя сяляне сеюць пераважна? Што прыходзіцца дакупляць гаспадарам? Ці шмат трымае вёска хатняе жывёлы, якой і чаму? Ці даволі вёска мае сена? лесу? Ці сяляне маюць заработкі на старане? якія? Калі сяляне выходзяць на працу грамадой? Якія майстры ёсьць у вёсцы? Вуліца вашае вёскі. Сады, гароды. Выган. Рэчка.

2. Хлеб.

З чаго пякуць хлеб? Якая бывае мука на хлеб? Дзе яе мелюць? Чаго бядак прымешвае да жытняе мукі? У чым расчыняюць хлеб? Якую вагу маюць баханы хлеба? Ці хапае вам свайго хлеба на год?

Практыкаваньне 78.

Дапамагла грамада.









1. Напішэце, што бачыце на гэтых малюнках і прыдумайце да напісанага загаловак.

2. Якое вам ведама здарэньне з жыцьця, калі таксама „дапамагла грамада“? Напішэце папарадку кароткімі сказамі, з кім і як усё было.

3. ПРЫКАЗКА. З міру па нітцы, голаму кашуля.

Практыкаваньне 79.

У ш к о л у.

Гэта адно апавяданьне, але зьлева апавядаецца ад I асобы (я... мяне... мне... мы... нас... нам...), а справа ад III асобы (ён .. яго .. яму... ім... яны .. іх... ім...), быццам падзея адбывалася не са мною, а з нейкаю іншаю асобаю, напрыклад, з Радзівонам. Параўняць адно з другім.

Я люблю хадзіць у школу. Я не прапускаю аніводнага дня. У сваёй торбачцы я нашу кніжкі, сшыткі і розныя прылады. Са мною заўсёды ідуць у школу Кандрат Пармёнак і Янка Кацюба. Дарогаю мы гаворым, што будзем рабіць у школе. Аднаго разу мы спазьніліся, і вучыцель зрабіў нам вымову. Я сяджу на аднай лаўцы з Кандратам.

Радзівон любіць хадзіць у школу. Ен не прапускае аніводнага дня. У сваёй торбачцы ён носіць кніжкі, сшыткі і розныя прылады. З Радзівонам заўсёды ідуць у школу Кандрат Пармёнак і Янка Кацюба. Дарогаю яны гавораць аб тым, што будуць рабіць у школе. Аднаго разу яны спозьніліся і вучыцель зрабіў ім вымову. Радзівон сядзіць на аднэй лаўцы з Кандратам.

Наступнае апавяданьне напісаць ад III асобы.

Першы раз у горадзе.



Дагэтуль я ніколі ня быў у горадзе. Бацька ўзяў мяне з сабою туды на кірмаш. Не даяжджаючы да гораду, я бачыў на шашы самаход. Выглядае, быццам нейкая вялізарная, чорная буда. У ім ёсьць машына; ён здалёку гудзеў, каб давалі дарогу, бо ехаў вельмі шыбка. Хто ехаў у ім, я не пасьпеў разглядзець.

Пад самым горадам ідзе чыгунка. Я бачыў пасажырскі цягнік. Вагонаў налічыў трынаццаць. З вагонаў выглядала шмат людзей. Бацька казаў мне, што сяляне мала ездзяць чыгункаю.



У горадзе мы стаялі на рынку. Бацька, прадаўшы збожжа, пайшоў кудысь, а мяне пакінуў сьцерагчы каня. Я сядзеў і глядзеў, як гаманіла ўсё навакол. Раптам бачу — Міколка з Сыцэвічаў! Вось я быў задаволены! Ён падсеў да мяне, і мы разам глядзелі на кірмаш. Каго і чаго толькі там ня было!... Бацька даў мне грошай, і я купіў сабе «Новую Зямлю» Я. Коласа.

Я не хацеў бы жыць у горадзе. Наша ціхая, маляўнічая вёска мне больш падабаецца.

3. *Заданьне.* Па дадзенаму ўзору напісаць кароткімі сказамі сваё апавяданьне, калі хто быў у горадзе. Што яшчэ бачылі вы цікавае ў горадзе? Калі хто ездзіў цягніком, напішэце дакладна пра сваю падарожу: калі, куды, з кім ездзілі? Што бачылі вы на станцыях, у вагоне, у часе самае падарожы? і г. д.

4 Пайшлі хлопцы на рэчку. Учапіўся і я з імі. Пачалі лавіць мянтузоў. Чым я горшы? — думаю. Закасаў рукаў кашулі і палез у ваду шукаць пад карчамі. Выцягнуў аднаго. Вельмі задаволены, палез яшчэ, ажно раптам... (прыдумаць заканчэньне і загаловак да гэтага апавяданьня).

5. *Якую з чаго чалавек мае карысьць.* На што ўжываецца салома? яліна? вугаль?—Ці варта трымаць гусі? — Што дае чалавеку ліпа? Каноплі? — На што патрэбна ў гаспадарцы гліна? попел? каменьне?

Прыклад. *Салому чалавек ужывае на подсьціл для жывёлы.*

Практыкаваньне 80.

1. *Напісаць па малюнку адказы.*

Дзе птушкі выбралі сабе месца для гнёздаў? Каго вывелі? Куды і чаго адляцелі? Што яны ўбачылі, вярнуўшыся да гнёздаў? Што пачулі, падляцеўшы бліжэй? Колькі было хлапчукоў? Што рабіў кожны з іх? Што пачалі рабіць птушкі, каб уратаваць сваіх дзетак? Ці ўдалося ім гэта? Ці стала каму шкада птушак? Ці добрую забаву прыдумалі хлапчукі?



2. Стаяла марозная зіма. Усё занесена глыбокім сьнегам. Бедным птушкам—сінючком, вераб'ём—ня было нідзе ніякае пажывы. Бачылі гэта дзеці, шкада ім стала птушак, і вось прыдумалі... (закончыць гэтае апавяданьне і прыдумаць да яго загаловак).

3. *Прыказкі.* Чужая болька нікому не баліць. — Каяньне позна ходзіць.

Практыкаваньне 81.

Каго? што?

1. *Адказаць на пытаньні.* Каго любіць маці? Што вострыць касец? Каго трэба шанаваць? Што купляе гандляр? Каго завуць шараком? Што калыхаў вецер? Што пяяў карагод? На што падае сьнег? Што купляў цыган? Што будуюць майстры? Каго паклікаў дзядзька? Што выробляе бровар? На каго пакінуты сіроты? Што дый што бачым мы ўночы на небе? Гной кладуць у вошта? Які дзень у тыдні мы сьвяткуем? а жыды? У вошта хавае гаспадар сена? збожжа? вопратку?

Падмайстар.

Пайшоў ужо другі тыдзень, як Зьмітрук падмайстрам зарабляе сабе хлеб у Юстына — шаўца з суседняе вёскі. Бязладны чалавек, да таго-ж горкі п'яніца Юстын. Але-ж куды было дзець Зьмітрука ягонай матцы, якая, пахаваўшы мужыка, выбівалася з апошніх сілаў, каб не памёрлі з голаду яе дзеткі — сіроткі? А іх у яе было чацьвёра. Зьмітрук самы старшы, меў адзінаццаць гадоў.

Яшчэ сонейка ня ўзыйшло, а Зьмітрок ужо цягне з лесу мяшок гальля — варыць сьнеданьне. Не пасьпеў прывалачы вядро вады ды выгнаць курэй, як прачнулася малое гаспадыніна дзіця. Гаспадыня кліча: „Зьмітрок, га Зьмітрок! ідзі, дзіця пакалышы!" Сядзіць Зьмітрок за калыскай гадзіну, сядзіць другую — хворае дзіця ня сьпіць, усё плача, ня сьціхае. Ужо і пасьнедалі, ужо Юстын другія халявы сшыў, а Зьмітрок, галодны, ўсё калыша ды калыша. І толькі як прышла маці паіць дзіця якімсьці зельлем, неяк успомніла пра Зьмітрука і сказала: „там на прыпечку ў місцы засталося заціркі — ідзі, зьясі. Хлеба на паліцы вазьмі". Есьць Зьмітрок заціркі, спадлоба паглядае на гаспадароў... успомнілася Зьмітруку родная хата — сьлёзы самі падыходзяць да горла...

— А куды ты, чорт, капылы закінуў? — крычыць Юстын.

Кумілём кінуўся Зьмітрок шукаць капылы, якіх ён ніколі і ў вочы ня бачыў.

— Ідзі, Зьмітра, дзіця пакалышы, — кліча гаспадыня. Ледзь дзіця трошку заспакоілася, знайшлася Зьмітруку новая работа.

— Ідзі, Зьмітра, будзем раьам ніткі змотваць, — кажа гаспадыня.

І вось, шавецкі падмайстар Зьмітрок сядзіць на ўслончыку і памагае гаспадыні змотваць ніткі...

Учора было сьвята. Юстын дзесьці зраньня „зашынкаваў" з сваімі таварышамі. Гаспадыня пайшла ім заапекавацца... У хаце застаўся адзін Зьмітрук — і за гаспадара, і за гаспадыню, і за няньку. Плакала малое дзіця, плакаў над сваёй доляй няшчаснай і малы Зьміцер, але хто-ж бы яго і чым усьцешыў?!

Пад вечар вясковыя хлапчукі клікалі Зьмітрука пагуляць з імі, але калі на парозе хаты паказалася гаспадыня, усе яны з перапалоху, як мышы, паразьбягаліся хто куды. — Праз адчыненыя вокны Зьмітрук чуў вясёлы дзіцячы гоман, сьмех, беганіну — тузаніну... І тут яму, як маланка, раптам убілася ў галаву думка...

Назаўтра, рана — раненька, яшчэ сонейка ня ўзыйшло, Зьмітрук ціханька падходзіў да свае роднай хаты...

2. **Напісаць адказы на пытаньні.** Да каго маці аддала Зьмітрука падмайстрам? Што прымусіла яе аддаць хлапца да чужых людзей? Якую працу рабіў там Зьміцер? Ці запраўды вучыўся ён на шаўца? Ці добра яго там даглядалі? Як адчуваў сябе Зьмітрук у чужых людзей? Як праходзіла для Зьмітры сьвята? Чаму ён уцёк да роднае хаты?

3. У каваля.

Чаго паслаў цябе бацька да каваля? Дзе была кузьня? Што дый што бачыў ты ў кузьні? Што рабіў каваль? Якую работу ён робіць для сялян? Ці патрэбна кузьня ў вёсцы?

4. *Загадка.* Сьпераду грэе, а ззаду вецер вее.



Практыкаваньне 82.

1. *Адказаць на пытаньні.* Што есьць шпак? бусел? верабей? вужака? вожык? вавёрка? авечка?

2. Што дае гаспадару сьвіньня? карова? каза? трус? курыца? пчолы?

3. Што селянін мае сваё? а што купляе ў краме?

4. Варонінае гняздо.

Дзе варона будуе сваё гняздо? З чаго яна робіць яго? Чым высьцілае? Колькі кладзе яечак? Якія яны бываюць па велічыні і на выгляд? Колькі часу выседжвае варона на гнязьдзе? Чым корміць варанятаў? Як варона вучыць іх лётаць?

5. *Чаго-ж ты навучыўся ў школе?* — спытаўся бацька у малога Міколкі, які хадзіў ужо дзьве зімы да школы. Што адказаў бацьку Міколка?

6. ЗАГАДКА. Чатыры чатырачкі, дзьве растапырачкі, сёмы вяртун.

Практыкаваньне 83.

Шэры бадзяга.

Сьцюдзёна ваўку, шэраму бадзязе. Гудзіць, завывае вецер у лесе. Усе дарогі засыпала сьнегам, усе сьцежкі замяло. Тоўстаю карою лёду пакрыліся рэкі і вазёры. Усё жывое пахавалася ў цёплых хатах, норах і бярлогах. Усё запаслося пажываю на зіму. Нават заяц, хоць які дурны, дый той не бядуе: бегае сабе ў цёплым кажушку ды маладыя галіначкі

абгрызае. Адзін шэры воўк ня мае нідзе прыпынку, ня мае ніякае пажывы.

Люты голад ганяе яго па лясных гушчарах, па бязьмежных лугох. Ані ўдзень, ані ноччу ня мае ён спакою. Бродзіць па сьнежных гурбах і ляскае зубамі. То падбяжыць, то прысядзе, ізноў падбяжыць, ізноў прысядзе, і ўсё ляскае зубамі. Толькі адна думка і грызе яго...

Вось недалёка вёска. Усяго, усяго там ёсьць у гаспадароў — і цялушак, і авечак, і парсюкоў! Але як забрацца ў хлеў? Да таго-ж і сабакі праклятыя пільнуюць...

Стаіць на ўзгорку шэры бадзяга і прыслухоўваецца...

Адказаць на пытаньні. Куды гэта прабіраецца воўк? Што яму патрэбна на вёсцы? Чаго ён спыніўся? Хто на вёсцы чуе зьбліжэньне ваўка?—Ці ня было калі ваўка ў вашай вёсцы? Напішэце гэтае здарэньне.

Практыкаваньне 84.

Каго? чаго?

1. *Адказаць на пытаньні.* Чаго прасілі ў бацькі дзеці? Каго ня любяць сабакі? З чаго ідзе дождж? У каго ёсьць грыва? Без каго дзецям цяжка ў хаце? З чаго робяць цэглу? паперу? гузікі? Да каго падбегла кураня? З чаго гоняць дзёгаць? Каля чаго быў прывязаны конь? Чые сьляды можна бачыць зімою ў лесе на сьнягу? Колькі сена зьядае за зіму адна карова? Чаго вучаць дзяцей у школе? Якіх грыбоў дзеці назьбіралі ў лесе?

2. *Дапісаць.* У нашым лесе ёсьць дзеравы хваёвыя і ліставыя. Лісьце ў асіны... Хвоя ў...

Не касец без... Не жняя без... Ня вучань без... Не шавец без... Не каваль без... Не гаспадар без...

3. *У лес па дровы.* Напісаць папарадку ўсе дзеяньні гаспадара падчас збораў у хаце і працы ў лесе.

Практыкаваньне 85.

Каму? чаму?

1. Малако даюць (каму?)..
Сена даюць (каму і каму?)...
Пацяруху даюць...
Зярняты сыплюць ..
Лялькі для забавы даюць..
Лякарства вызначаюць...

2. Каму прышло пісьмо? Каму патрэбна сякера? а шыла? Каму налажылі ашыйнік? Каму і што ты падараваў? Каму і ў будзень сьвята? Каму і што расказвала бабуля? Чаму дый чаму ня трэба верыць? Каму забаўкі, а каму сьлёзкі?

3. Малако.

Хто дае малако? Якога колеру цёплае малако (сырадой)? А якое яно на смак? А яшчэ якое бывае малако па смаку? Якое табе болей падабаецца? Дзе трэба трымаць малако, каб ня скісла? Ці каровы заўсёды аднолькава даюць малака? Ад чаго гэта залежыць? Каму вельмі карысна для здароў'я піць малако?

Самаабслужваньне ў школе.

Хто ў вашай школе робіць усе чорныя работы, каб падтрымаць чыстату і парадак? Калі стораж, дык ці не маглі-б вучні самі працаваць замест стоража? Каму тады ляпей за ўсё было-б падзяліць між вучнямі працу? Паглядзеце на малюнкі і напішэце, што робяць вучні. Якая з усяго гэтага ёсьць карысьць для самых вучняў? для школы? Як можна было-б выкарыстаць тыя грошы, якія застануцца ў школе, калі яна будзе абходзіцца бяз стоража?

Практыкаваньне 87.

Кім? Чым?

Чым жнуць жыта? Чым гаруць землю? Чым мятуць вуліцу? Чым выймаюць гвазды з дзерава? Чым куры разграбаюць сьмецьце? Чым чысьцяць адзеньне? З чым ядуць кашу? З кім Тодар пасьвіў сяньня каровы? Над кім нахіліўся доктар? Кім гэты рабочы служыць у друкарні? Пад чым ляжалі жалуды? Чым рухаецца машына? Кім-бы ты хацеў быць, калі вырасьцеш?

Голь на выдумкі—багатыр на грошы.

Усе даўно пачалі хадзіць у школу, адзін Міколка марнуецца ў хаце. Ня мае ўвошта абуцца, ня мае чым і апрануцца. Міколкаў бацька летась памёр, пакінуўшы ўдаву і трое дзяцей — сіротак. Маці ледзь-ледзь можа пракарміць сваіх дзяцей, дзе-ж тут думаць яшчэ пра вопратку ці абутак для іх? Сама ходзіць босая.

Міколка вельмі хацеў хадзіць у школу. Ен троху ўжо навучыўся чытаць па газэце. Але як пайсьці ў школу без абутку, бяз вопраткі? Думаў, думаў Міколка і напасьледак прыдумаў. Выстругаўшы дзеравяныя калодачкі з абсацамі і ададраўшы ад старых камашаў рэшткі падошвы, ён прыбіў перады драцянымі скобачкамі да калодак. Хоць ня прыгожыя вышлі дзераўлянікі, але абуць было можна. Далей Міколка выпрасіў у маці старую ватоўку; падперазӑўшы яе аборынкай, ён назаўтра пайшоў да школы. Вучні спаткалі нашага багатыра сьмехам і жартамі, аглядалі яго дзіўныя боты і скубалі за рызьзё ватоўкі. Але Міколка не зварочваў на гэта ўвагі. Сеўшы ў куточку на лаўку, ён спакойна чакаў, пакуль прыдзе вучыцель. Вучыцель запісаў Міколку Чапалёнка ў кніжку. Адзін з вучняў падараваў яму свой леташні лемантар. Увечары Міколка прыйшоў да хаты задаволены і шчасьлівы, што збыліся яго мары.

Напішэце працяг гэтага апавяданьня, прыдумаўшы, як Міколка ў далейшым вучэньні забясьпечваў сябе кніжкамі, рознымі прыладамі, вопраткай і г. д., і як пазьней памагаў свайму малодшаму брату і сястры вучыцца ў школе.

Дзеньнік.

Вясна ідзе. Тае сьнег. Са стрэх капаюць каплі. На ўзгорку паказалася лапінка. Прыляцелі грачы.—Па лекцыях гулялі ў сьнежкі.

Рэчка ачысьцілася ад лёду. Распускаецца вярба. Юры ўжо бачыў буслоў.—Сяньня чысьцілі школьны сад.

Хай кожын вучань зробіць сабе з чыстае паперы *дзеньнік* (сшыток), каб запісваць у ім зьмены пагоды, назіраньні прыроды, розныя падзеі ці здарэньні з агульнага, школьнага і асабістага жыцьця, аб школьных экскурсіях, прачытаных кніжках і г. д. Дзеньнік трэба пісаць кожны дзень. Добра было-б проціў запісаў зьмяшчаць малюнкі таго, што ўпісваецца ў дзеньнік.

Зьмены пагоды можна ўпісваць і ў асобны *календар пагоды*. У календары пагоды адзначаецца стан паветра (тэмпэратура) і пагоды (дождж, сьнег, мароз, вецер, навальніца, галалёдзіца, ясны дзень, хмарны і г. д.), таксама зьвязаныя з пагодаю гаспадарскія работы, народныя прыметы і інш.

Вераб'і і ластаўка.

Аднаго разу стадка вераб'ёў пачала жаліцца ластаўцы на крыўду, якую яны маюць ад людзей. — Мы сабе, кажуць, жывём ціханька: чужога хлеба не ямо, нічога не чапаем, нікому дарогі не пераходзім... Ня шмат нам і патрэбна чаго: маленечкае зярнятка ці ягадзінку, або вусеня якога перахапіць—вось і ўся наша пажыва. Тымчасам людзі нас так лаюць, ганяюць, нават песьні злажылі пра нас нядобрыя. Другога імя, як „злодзей, дармаед" нам няма ад іх. Нас толькі—кажуць — біць трэба, і б'юць, б'юць, не шкадуючы.

Слухала, слухала гэта ластаўка, дый кажа:

— Зусім справядліва ў людзей ідзе пра вас такая слава. Я ў вас спытаюся: хто ня вылазіць летам з ячменю або проса ў полі? ці ёсьць хто больш за вас ласы на кавапельку? Хто гэта і да карыта, і да жолаба цэлаю грамадою — ну ж дзюбаць, ну-ж выдаць, ну-ж рабаваць! Каго не аджанешся ад сьпелых чырвоных вішань або чарэшань? На каго гэта па гародах ці палёх ставяць усюды пугалы?



Добра, каб вы хоць баяліся іх, а то толькі адзін дзень ціха: назаўтра, наеўшыся проса, ужо на галаву не сароміцеся залезьці гэтаму пугалу. Не з свае, а з чужой працы жывеце вы, дармаеды! Вы ўсім добра даліся ў знакі. Узяць хоць бы нас, ластавак: хто гэта забіраецца ў нашыя гнёзды выводзіць дзяцей, замест каб будаваць свае ўласныя? Каго гэта мы ня раз замуроўвалі ў сваіх гнёздах? А, маўчыцё? Мо скажаце — няпраўда?

Глядзеце, — кажа ластаўка, — на нас. Чаму мы не трапляем на зьнявагу якую ад людзей? Мы на людзкое дабро не зазіраемся, ловім сабе мушак, кузурок розных, пільнуем сваіх дзетак, сваё гнязьдзечка... і людзём ня тое, каб шкоду якую рабіць: наадварот, хочам ім у чым-колечы і памагчы: гаспадара мы засьцяражом ад блізкае буры ці дажджу, гаспадыні мы дапільнуем яе птушыную гаспадарку ад страшнага ворага-шуляка. Як мы да людзей, так і яны да нас. Людзі ня толькі не чапаюць нашых гнёздаў, якія заўсёды будуем цяжкаю працаю пад стрэхамі іхных хатаў, а яшчэ бароняць нас ад нядобрых дзяцей сваіх.

Вось так, мілыя вы мае! кажа ластаўка верабейкам. Кіньце свой нораў паганы, тады ня будзе вам і зьнявагі ад людзей.

Выслухалі вераб'і свой прысуд, зачырванеліся ад сораму і, віноватыя, нічога не сказаўшы, паляцелі... куды бы вы думалі, дзеці?

1. Напішэце (асобна) пра вераб'ёў і ластавак, адказаўшы на такія пытаньні: які іх выгляд? чым жывяцца? чаму яны трымаюцца людзкіх сялібаў? Дзе і з чаго яны робяць свае гнёзды? Колькі кладуць яечак? Колькі тыдняў сядзяць на яечках? Ці вылятаюць у вырай? Чаму? Хто з іх дармаеды, а хто жыве з працы свае?

2. ПРЫКАЗКА. На чужое сала і котка гаспадыня.

Практыкаваньне 89.

1. **Напісаць адказы.** Чым бароніцца конь? воўк? кот? аса? вужака? вожык? гусак? рак?

Чым мы чуем? бачым? нюхаем? ашчупваем? смакуем?

Пяць органаў знадворных адчуваньняў: зрок (вочы), слух (вушы), нюх (нос), вошчуп (усё цела) і смак (язык).

2 *Аб кім? аб чым? на кім? на чым? у чым?*

На чым растуць яблыкі? Аб кім расказваў сяньня вучыцель? Пры кім жывуць дзеці? У чым варыцца абед? Па чым езьдзяць санкамі? Пры кім працуе падмайстар? На чым зьявілася раса? На кім сяньня новы кажух? Па чым пайшлі авечкі? Аб чым спрачаліся Гаўрыла і Параска? У чым зімуе мядзьведзь? а вавёрка?





3. *На чым езьдзяць людзі?*

Па зямлі езьдзяць...
Па вадзе езьдзяць...
У паветры...
У халодных краёх...
У цёплых краёх..



4. ПРЫКАЗКА. У машыніста хлеб траякі: чорны, белы і ніякі.

Практыкаваньне 90.



Круглае поле. Горы каменьня. Лес па краёх, як сьцяна. Ціха ўсюды. Нудна на сэрцы. Птушка ня крыкне нідзе ніадна. Могілкі ў полі адны-адзіноткі. Праслы гнілыя на землю ляглі. Крыж пахінуўся, як кветка у буру. Многа іх, многа ляжыць на зямлі. Кучка бярозак, вярба ды хваінка. Вецер разьвеяў іх, дождж спаласкаў. Вось дзе ад гора мужык адпачыне! Вось дзе ён думкі і сьлёзы схаваў!.

(Якуб Колас).

1. **Напісаць пра могілкі вашае вёскі.** Дзе яны знаходзяцца? Якое месца выбрана пад могілкі? Ці агароджаны яны? Ці шмат ёсьць дзеравоў? Як дагледжваюць іх сяляне? Хто з тваіх блізкіх, родных пахованы там? Ці ёсьць якія памятнікі на могілках?

2. Напісаць, што было, калі я аднаго разу пайшоў увечары на могілкі.

Практыкаваньне 91.

1. Чым кормяць коні? каровы? авечкі? куры? гусі?

2. Чым пакрыта цела качкі? мядзьведзя? рыбы? барана? чарапахі?

Прыклад. *Цела рыбы пакрыта лускою.*

Сьвіначка.

— Сьвіначка, дзе была?

— У суседа на дварэ.

— Ну, што там?

— Кепска! Ніякага парадку: двор чыста вымецен, усюды чыстата. Нельга ні ў гразі пакапацца, ні ў лужы пакачацца.

(З „Чырв. Зьмены").

3. Чым кормяць сьвіньню? Дзе яна жыве? Якой масьці бываюць сьвіньні? Колькі парасяткаў можа прывясьці сьвіньня? Чым карысна, а чым шкадліва сьвіньня?

Школьная экскурсія.



З якою мэтаю пайшлі гэтым разам у лес? Што трымае ў руках вучыцель? На што ён зварочвае ўвагу вучняў? Які карэнь, сьцябло, лісьцьцё, краскі ў гэтае расьліны? Ці глыбока яна пускае карані ў землю? Якую выбірае для сябе землю? Шукае сонца ці цень? У залежнасьці ад гэтага якая будова, выгляд усяе расьліны? Параўнаць з іншымі расьлінамі. Параўнаць некалькі розных экзэмпляраў дадзенае расьліны і вытлумачыць, ад чаго залежыць розьніца. Што вучні прынясуць з экскурсіі ў школу? Што з усім гэтым будуць рабіць?

Практыкаваньне 92.

Бакі кругавіду: усход, захад, поўнач і поўдзень.

1. Напішэце, што знаходзіцца ад школы на поўдзень? на ўсход? Куды птушкі лятуць у вырай? З якога ў які бок цячэ вашая рэчка? Скуль сяньня дзьмець вецер? Які вецер найчасьцей прыносіць нам дождж? сьцюжу? сухмень? Як называецца старана між усходам і паўднём? між захадам і поўначай? У які бок кругавіду пойдзеш ты са школы? У якой старане зьяўляецца маладзік? поўня?

Гадзіньнік.



Гадзіньнік кішанёвы.



Гадзіньнік сьценны.

2. *Адказаць на пытаньні* Колькі стрэлак мае гадзіньнік? Для чачаго служыць кожная? Калі гадзіньнік паказвае поўдзень? Колькі паказваюць намалёваныя гадзіньнікі? Хто майструе і папраўляе гадзіньнікі? З чаго робяцца вечкі кішанёвых гадзіньнікаў? Як у залежнасьці ад гэтага называюцца кішанёвыя гадзіньнікі?

3. ЗАГАДКА. Ідзець, ідзець, а з месца ня сойдзець.

Практыкаваньне 93.





Калі? дзе? куды? адкуль?

Калі пачынаецца вясна? Калі сяляне возяць з балота сена? Калі цьвітуць садовыя дзеравы? Дзе выраблюць машыны? Дзе мігацяць зоркі? Калі пачынаецца касавіца? Дзе растуць наготкі? мядувачка? Дзе купляюць вяроўкі? Калі бывае „бабскае лета"? Дзе хаваюць на зіму бульбу? Калі беларусы сьвяткуюць Коляды?

Адкуль сяньня дзьмець вецер? Куды селянін павёз гной? Куды адлятаюць птушкі ў вырай? А скуль прылятаюць? Куды бягуць усе рэкі? Скуль сьцякаюць вясною ручайкі? Куды скокнула жаба? Куды ідзе дым з печы? Куды пайшла гэтая дарога? Скуль узяліся каля вёскі ваўкі?

Галодны год.

Дзе тонка, там — кажуць — і рвецца. Так сталася і ў Піліпавых. У Піліпа свае зямлі вузенькая, вузенькая палоска. Кожын год ён бярэ запашкі ў пана або багацейшых суседзяў. Працуе з жонкай усё лета, б'ецца, як тая рыба аб лёд, а карысьці мала. Забяруць палову ўраджаю, і Піліпу вясной не хапае хлеба. Бывала, пазычыць у суседа пудок жыта, прызаробіць дзе-колечы, „пахлюбаюць" месяц—другі, і так-сяк дацягнуць да жніва.

Мінулую вясну суседзі нараілі Піліпу ўзяць пазыку з банку. „Што — кажуць — цярпець? аддасі ўвосень!" — Паслухаў Піліп і ўзяў сто злотых пазыкі. Купіў насеньня, хлеба і — грошай як і ня было. — Нічога, — думае Піліп, — прадам пудоў пяток жыта, лёну і зьвярну гэты доўг. Ажно, як на тую пагібель, вышла вялікая няўрода: прапала жыта, згніла — вымакла бульба, змарозіла яшчэ зялёны ячмень і лён.

Страшны госьць — голад пасяліўся ў Піліпавай хаце. Няма чым аддаць пазыкі: няма грошай, няма і хлеба. І вось сяньня апісалі за доўг і павялі апошнюю Піліпаву кароўку. Галосіць Піліпава жонка, плачуць, прытуліўшыся да яе, трое малых дзетак. Толькі старшы 12-гадовы Ігналя ня плача. Яго вочкі гараць, як вугальчыкі. Сьціснуўшы кулачок і сьцяўшы са злосьці на кагось зубы, ён задумлённа пазіраў на маці. Напасьледак і ён не сьцярпеў. Падыйшоў да маці і пачаў яе ўгаварваць.

— Ня плач, мама!... Як я вырасту, тады ня будзем галадаць. Я ня дам адбіраць кароўкі... Будзем і мы мець зямлі больш... Яе на ўсіх павінна хапіць... Пацярпі, мамка!...

І ў Ігналькі паліліся з вачэй гарачыя сьлёзы.

Асака.

1. *Адказаць на пытаньні.* Колькі было свае зямлі ў Піліпа? Ці хапала Піліпу хлеба да новага жніва? Што ён рабіў кожны год? Ці аддаваў Піліп свой доўг суседзям? Што на гэты раз параілі Піліпу? Ці ўзяў Піліп пазыку? дзе? колькі? На што ён патраціў пазыку? Ці было чым аддаць пазыку? Чаму? Што ўзялі ў Піліпа за пазыку? Якая гэта была страта для сям'і Піліпа? Хто хацеў усьцешыць маці? Што Ігналя сказаў ёй?

2. Напішэце кароткае апавяданьне па гэтаму малюнку.

Саматугам.



1. Напішэце, што бачыце на гэтых малюнках.

2. ВОЛЬНЫЯ ТЭМЫ.

Як вясковыя дзеці забаўляюцца зімою. — Мой першы дзень у школе. Як я навучыўся плаваць.— У доктара. — На пільні.

Зайцава навука (з украінскага).

Вясёла зьзяе сонейка і ўсім аднолькава сьвеціць і грэе. Прыгрэла яно на краі лесу і старога зайца з зайчанятамі. Скачуць зайчаняты, забаўляюцца, скубуць расістую травіцу. А стары заяц кліча да сябе дзяцей і вучыць іх, як на сьвеце жыць, як усьцерагчыся ад бяды.

— Шмат у нас, зайцоў, ой як шмат лютых ворагаў! І воўк, і ліс, і арол, і сава. А найгоршы наш вораг — чалавек з стрэльбаю і сабакамі. Ані ўдзень, ані ноччу ня сьпі, бойся, сьцеражыся. Лютых ворагаў шмат, а абароны ніякае. Няма ў нас ані вострых пазуроў, ані моцных зубоў. Уся абарона наша ў нагах. Як зачуеш бяду — уцякай хуценька. Ох, цяжка жыць на сьвеце, дзеткі вы мае, ах як цяжка! А яшчэ горш было-б, каб мы, зайцы, самі сябе крыўдзілі. Згодна, дзеткі, жывеце, не рабеце адзін аднаму ніякае крыўды, а толь-

кі ворага засьцерагайцеся. Дасьць Бог, пражывеце шчасьліва свой век.

3. Напісаць, якіх ворагаў маюць вавёркі? мышы? жабы?— У чым адзін ратунак для іх?

4. Напішы сваю ўлюбёную казку.

Практыкаваньне 95.

Я Беларус.

Мой тата Беларус, мая маці Беларуска, нашыя дзяды і прадзеды таксама былі Беларусамі. Як і яны, жыву я на Беларусі. Мы гутарым беларускаю моваю. Таму і я Беларус.

Усе Беларусы, дзе-б яны ні жылі—мае родныя браты. Калі мы робім што, дык павінны так рабіць, каб перадусім Беларусі, ды беларускаму народу з таго дабро было. Таксама і сваю родную мову мы павінны любіць больш за ўсе мовы на сьвеце, бо ўжо ад калыскі маці вучыла нас гаварыць роднаю моваю. Але ж мы павінны адначасна і ўсе іншыя народы шанаваць, і ўсім людзям нясьці заўсёды сваю помач і спачуваньне.

1. **Напісаць адказы на пытаньні.** Якая мова твая родная? Якія яшчэ ўжываюцца мовы на Беларусі? Для каго перадусім трэба кожнаму Беларусу працаваць? Як трэба адносіцца да ўсіх іншых людзей? Як трэба жыць з суседзямі?

2. **Прыказка.** У сваім краі, як у раі.

ДЗЕТКАМ.

Вучэцеся, дзеткі, дужэйце на волі,
Каб скарбы навукі знайсьці,
Каб лепш было з жыцьцем змагацца за долю
На роднай і мілай зямлі!
Бо цяжка, ой цяжка змагацца тым людзям,
Хто ў вечнай цямноце жыве!
Ня бачыць ён сьвету і бачыць ня будзе,
Бо сьвет той навука дае.

М. Раманоўскі.

Узоры для вольных малюнкаў.

Тут паказана, як аднымі толькі самымі простымі лініямі, засьцерагаючы пэўную паступовасьць, лёгка можна маляваць навакольныя прадметы і жывыя істоты ў розных палажэньнях.







СЛОУНІК

трудных па правапісу слоў.

Аб‘ежчык, аб‘яджаць
аброць, вобраць
абсац
абуцьце
абцугі, абцужкі
авадзень
аддаць
адзеньне
Аляксандар
Амяльлян
апавяданьне
асьцярожна
Аўгень, Аўгеньня
Аўдоцьця
аўсянік, аўсянка
аўчына, аўчынавы.

Бабка
барджэй
бацькаўшчына
безрабоцьце
бляшка
больніца
бражджотка
бродзень
брусьніцы
бручка
брындзюлька
будзіць
бязладзьдзе
бярвеньне
бярэзьнік

Вавёрка
вагзал
важкі
варстат
варыўня
ваўняны
вязьці, вязу, вёз
вэлясыпэд
верацяно
верашчака
Вільня
вобалак
воўк
вуж, вужака
вусень
вярблюд
вятох.

Гаёк, гай
газьніца
гальлё
гандляр, гандляваць
ганьба
гасьцінец
гасьцініца (заезд)
глёбус
гняздо—гнёзды
гнязьдзечка
гойдацца
грамадзкі, грамадзянін
грызьці
гумнішча
гунька
гушканка, гушкацца

Даёнка, дайніца
джгала
дзёгаць
дзед, дзяды
дзерава, дзеравяны
дзіра, дзірван
дзічка
дзьверы
Дзьвіна
дзюба
дзядзька
дзянёк, дзянькі
дзяруга
дзяўбаць, дзюбаць
дзяўчына
дождж
досьвітак
дошчачка
драбкі
дрывасек
дудка.

Езьдзіць, едзьце
елка
емісты, ёмкі
ёрш, яршок
есьці—есьць, зьеў
ёсьць, ёсьцека

Жаласьлівы
жалезка
жанчына
жолуд-жалуды
жоўты
журавіны
жураў
жучок
жыхар
жыцьцё
жычка
жэрдка, жэрдзь
жэўжык.

Загадчык
зазубень
замерзьці, замёрз
зарэчча
заўсёды
зайграць
збожжа
зброя
зельле
ззаду, сьпераду
злодзей
зрэб‘е
зьбялець
зьбянтэжыць
зьвер, зьвярыны
зьверху—зьнізу

зьдзек
зьдзіў
зьмена
зьмяя
зьнішчыць
зэдэль, зэдлік
зязюля
зялёнка

Ігрышча

імжака
індык
істужка
ісьці.

Казьляк

каламажка
каменьне, каменны
каптан
карандаш (аловак)
карэньчык
касьцёл
касьцяны
кіёчак
кілямэтр
кісялёўка
клешчы
клін
кнігаўка
кныш
коўдра
коўзацца
краўчыха
краябраз
крываўнік
ксёндз
кудзеля
кужаль
кузьня
кулёк
курасьлеп
куцьця

Лагчына

ламачча
ландыш
лебедзь
лезьці
лётнік
лешч
лісьце. лісьцяны
ліхтар
ложак
ложка
лузга, луска
лядзянка
лясьнік
ляшчына

Маёнтак

маджэр
маладзік
малацьбіт
маліньнік
маўклівы
майстар, майстроўня
медзь, мядзяны
места (горад), мястэчка, мескі (гарадзкі)
месца (пляц), мясцовасьць, мясцовы (тутэйшы)
моладзь
мядзьведзь
мядуначка
мяккі, мягкі
мяўкаць
мяцёлка

Найміт, наймітка

насеньне
натоўп
наўкасяк
наўмысна,
наўцекі
начоўкі, ночвы
невуцтва
Нёман
нерат
Нічыпар
ноччу
нырэц, нырка
нябожчык
нячысьцік
няшчасьце

Падглядач

падсядзёлак
падтрымаць
панадворак
партманэт
пасьвіць, пасьвіцца
паўдзён, паўдзённы
паўзьці, паўзун
пацяруха
паштоўка, паштальлён
пайсьці, пайшоў
перайсьці,
перапёлка
пераплётня
персьцень, пярсьцёнак
пешаход
піцьцё, пітво
плысьці, плыўкі
пляменьнік
подсьціл
посьцілка
поўня
поўсьць
пошасьць
прыгуменьне
прызба, прызьба
пстрычка
пузыры—паўхіры
пярэчыць—спрэчка
пясьняр
п'яўка
пяшчаны.

Рабізна

ражка
развалкі, розвальні
ральля
рамонак, румянак
рамяство
расьці
ржышча
рожкі
рохкаць
рыдлёўка
рыжок—рыжкі
рэзгіны
рэдзька

Саломены

селядзец

смарчок
сланечнік
спружынаўка
стрыкаты, пярэсты
сьвердзёл
сьвіньня
сьвярбець
сьлімак, смоўж
сьмелы, сьмялей
сьнеданьне
сьнітка
сьпяшацца
сьцежка
сьцёбаць
сьцяг
сьцяна
сэрца
сякач
сяўба.

Тамашоўка

тачыльня
таўкач, таўчы
таўшчыня, тоўсты
трысьцё
тутун, цюцюн
тхор.

Уздоўж, упоперак

узьлесьсе
умалот
умаўляць
упрэць, управаць
ураджай
уток
уцякаць, уцячы
уюн

Фабрыка

фэльчар
фіялкавы, фіялкі
фурман

Хаўтуры

хвартух
хвошч
хлусьня
хмызьняк
хрусьцець
хрушч
хрысьціянін

Цадзілка

цёлка
целяпацца
цёмна
церазсядзельнік
цёрліца
цесьць, цешча
цотны
цыбук
цызорык
цьвік
цьвісьці
цьвярозы
цьмяна
цэўка
цюцік
цяжкі, цяжар
цяля, цялячы.

Чаляднік

чароўны, чараўнік
чарсьцвець, чорствы
чарэмха, чаромуха
чаўнок, човен
чаўпсьці
чашчэвік
чмель
чыгун, чыгунка
чыж, чыжык
чысьцяк.

Шавец-шаўцы

шалёны
шаляноўка
шасьціножка
шляхціц
шоўк, шаўковы
шчаня, шчаніцца
шчарбаты
шчыгол
шыпшына
шэрсьць
шэршань

Экзамін

эканом
экскурсія

Юргіня

юшка, юха

Язда, яздок

язьмен
ялаўка, ялавы
Яўмен
яшчарка

Усе кліше, зьмешчаныя ў гэтай кнізе, апрача некалькіх (стр 29, 43, 47, 52, 66, 69 і 80), зьяўляюцца ўласнасьцю аўтара і без яконае згоды ня могуць быць перадрукованымі.

ВЫЙШЛА З ДРУКУ КНІЖКА

1) С. Паўловіча. „ПІШЫ САМАДЗЕЙНА“.

Разьвіцьцё навыку самастойнаіа пісьма. Пасобнік для беларускае школы і самавукаў. З лічнымі малюнкамі мастака М. Васілеўскаіа. Ч. І. Першы год навучаньня (пасьля азбукі). Выданьне аўтара. Вільня, 1929 г. (для вучняў).

2) Таго-ж аўтара „МЭТАДЫЧНЫЯ УВАГІ“

да пасобніка «ПІШЫ САМАДЗЕЙНА», 15 стр. (для настаўнікаў).

ПРАДАЮЦЦА ВА УСІХ БЕЛАРУСКІХ КНІГАРНЯХ У ВІЛЬНІ І НА ПРАВІНЦЫІ. — — — — — —

Галоўны склад у аўтара:

WILNO, UL. FILARECKA, Nr. 18, m. 5.